Дзяржаўная ўстанова культуры
«Сетка публічных бібліятэк Мсціслаўскага раёна»

# Каляндар
## знамянальных і памятных дат
## на 2023 год

*Мсціслаўскі раён*

Мсціслаў, 2022

Каляндар знамянальных і памятных дат па Мсціслаўскаму раёну на 2023 год: бібліяграфічны паказальнік /ДУК “Сетка публічных бібліятэк Мсціслаўскага раёна”; Аддзел абслугоўвання і інфармацыі; [складальнік С.В. Хмуровіч; адказны за выпуск Н.В. Сідарэнкава]. – Мсціслаў : Мсціслаўская цэнтральная бібліятэка, 2022. — 60 с.

«Краязнаўчы каляндар» – бібліяграфічнае выданне, якое дапаможа чытачам лепш пазнаць свой край, а бібліятэкарам – прапагандаваць краязнаўчую літаратуру.

Уключаныя ў каляндар знамянальныя і памятныя даты адлюстроўваюць важныя падзеі гісторыі, грамадскага, гаспадарчага і культурнага жыцця нашага раёна, дзейнасць выдатных людзей, звязаных з нашым краем.

Да кожнай даты даецца кароткая даведка, указваецца літаратура. У якой часам сустракаюцца і ілюстрацыі.

Матэрыялы каляндара можна выкарыстоўваць пры рэкамендацыі літаратуры чытачам, арганізацыі выстаў літаратуры, для падрыхтоўкі гутарак, аглядаў літаратуры, тэматычных вечароў, папаўнення краязнаўчых картатэк.

## Знакамітыя людзі

### 100 год з дня нараджэння Героя Сацыялістычнай працы, Аўраменка Валянціны Усцінаўны

**Аўраменка Валянціна Усцінаўна** нарадзілася 12 чэрвеня 1923 г. у в. Рожава Мсціслаўскага павета ў сялянскай сям'і. З 1943 г. – калгасніца калгаса "Шлях камунізма", а з 1965 г. – рабочая жывёлагадоўчай фермы – даярка саўгаса "Мсціслаўскі".

У 1971 г. за поспехі ў развіцці сельскагаспадарчай вытворчасці і выкананні пяцігадовага плана па продажу прадуктаў земляробства і жывёлагадоўлі ўзнагароджана ордэнам Леніна.

**Літаратура:**

Аўраменка Валянціна Усцінаўна: Узнагароджаны ордэнам Леніна// Памяць: Мсціслаўскі раён: Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі.–Мінск, 1999.–С. 501.

### 190 год з дня нараджэння Багданоўскага Еўстафія Іванавіча, выдатнага рускага хірурга, доктара медыцынскіх навук, прафесара

**Багданоўскі Еўстафій Іванавіч** нарадзіўся 20.09.1833 г. ў вёсцы Падолкава (Падсолтава) Мсціслаўскага павета. Выдатны рускі хірург, доктар медыцынскіх навук (1861), прафесар (1863). Скончыў Пецярбургскую медыка-хірургічную акадэмію з залатым медалём (1858). Як лепшы выпускнік Е.І. Багданоўскі быў пакінуты пры акадэміі і пачаў спецыялізіравацца па хірургіі.

У 1861 г. абараніў доктарскую дысертацыю і пасля двухгадовай замежнай камандзіроўкі быў абраны ад'юнктпрафесарам акадэмічнай хірургічнай клінікі. Потым стаў загадваць кафедрай аператыўнай, а пасля тэарытычнай хірургіі, а ў 1869 г. – акадэмічнай хірургічнай клінікай, з 1870 г. – загадчык кафедры шпітальнай хірургіі, якую ён узначальваў да канца жыцця. У час руска-турэцкай вайны быў на тэатры ваенных дзеяннеў.

Е.І. Багданоўскі – хірург-прыхільнік максімальнага выкарыстання кансерватыўнага (безаператыўнага) лячэння. Сярод вучняў Багданоўскага шэраг выдатных хірургаў-прафесараў: В.А. Рацымаў, І.С. Субоцін, С.Н. Каломін з годнасцю прадстаўлялі айчынную хірургію на міжнародных кангрэсах.

У будынку былой Медыка-хірургічнай акадэміі (зараз Ваенна-медыцынская акадэмія імя С.М. Кірава) ёсць помнік Е.І. Багданоўскаму і мемарыяльная дошка з надпісам: "Тут сярод вучняў, не закончыўшы аперацыю пачатай у аўдыторыі 11 кастрычніка 1888 года, памёр вядомы прафесар Еўстафій Іванавіч Багданоўскі".

Памёр Е.І. Багданоўскі 11 кастрычніка 1888 г.

**Літаратура:**

Гасянкоў, У.Л. Багданоўскі Еустафій Іванавіч : аб выдатным рускім хірурге Е.І. Багданоўскім/ У.Л Гасянкоў // Памяць: Мсціслаўскі раён: Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі.–Мінск, 1999.– С. 77–78.

## 110 год з дня нараджэння Басава Беніяміна Мацвеевіча, графіка і жывапісца

**Басаў Беніямін Мацвеевіч**нарадзіўся ў 1913 годзе ў Мсціславе. Графік і жывапісец. Вучыўся ў 1938-1948 гг. у Маскоўскім дзяржаўным мастацкім інстытуце імя Сурыкава. Удзельнік мастацкіх выставак з 1945 г. у 1935-38 гг. жыў у Беларусі. Працуе пераважна ў кніжнай графіцы. Ілюстраваў кнігі: “Наперададні”, “Рудзін”І. Тургенева, “Чалкаш” М. Горкага, “Белыя ночы” Ф. Дастаеўскага і інш. Напісаў карціны: “Справаздачны канцэрт” (1954), “За кнігай” (1956), “Транспарт” (1964) і інш.

**Літаратура:**

Бениамин Матвеевич Басов// Художники народов СССР : библиографический словарь.–Минск, 1970.–Т. 1.–С. 300.

Басаў Беніямін Мацвеевіч// Дзеячы выяўленчага мастацтва: бібліяграфічны паказальнік; складальнік Н.І. Цыбулёва. –Магілёў, 1993.–С. 5.

Юрченко, Г. Художник из Мстиславля / Г. Юрченко // Нёман. – 2004. – № 9. – С. 169–171.

Юрчанка, Г. Мсціславец – ілюстратар рускай класікі / Георгій Юрчанка // ЛіМ. – 2007. – 26 студзеня. – С. 12.

## 105 год з дня нараджэння жывапісца, Басава Ізраіля Мордухавіча

**Басаў Ізраіль Мордухавіч** нарадзіўся ў 1918 годзе ў Мсціславе. Беларускі савецкі жывапісец. У 1951 г. скончыў Мінскае мастацкае вучылішча. У мастацкіх выстаўках удзельнічае з 1951 г. Працуе пераважна ў жанры гарадскога і індустрыяльнага пейзажа. Сярод твораў: “Зялёны Мінск” (1961), “Гарадскі матыў” (1962), “Мелодия” (1970) і інш.

**Літаратура:**

Ізраіль Мордухавіч Басаў// Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі. – 1984. – Т. 1. – С. 311.

Израиль Мордухович Басов// Художники советской Беларусии.–Минск, 1975.–С. 31.

Израиль Мордухович Басов// Художники народов СССР: биобиблиографический словарь.–Москва, 1970.–Т. 1.–С. 301.

Басаў Ізраіль Мордухавіч// Дзеячы выяўленчага мастацтва Магілёўшчыны: біябібліяграфічны паказальнік; [складальнік Н.І. Цыбулёва]. –Магілёў, 1993.–С. 6.

Салодкіна, Л. Вяртанне ў горад: жывапіс Ізраіля Басава/ Л. Салодкіна // Мастацтва.–1992.–№11.–С. 24–26.

Юрчанка Г. Мацвей Басаў і яго палотны:М.Басаў / Г.Юрчанка // Святло Кастрычніка. – 2010. – № 78–79. – С.5.

## 130 год з дня нараджэння Батая Уладзіміра Васільевіча, Героя Сацыялістычнай працы

**Батай Уладзімір Васільевіч**нарадзіўся 28 ліпеня 1893 г. у Мсціславе ў сям'і рабочага. У 1906 г. скончыў трохкласную прыхадскую школу ў Мсціславе. Рана пазнаёміўся з працай. Спачатку працаваў на будоўлі гімназіі (будынак быўшай першай сярэдняй школы) чорнарабочым, потым фурманам у купца. З кастрычніка 1912 г. па снежань 1914 г. працаваў слесарам Дняпроўскага Руска-Бельгійскага таварыства ў пасёлку Енакіева Екацерынаслаўскай губерні (цяпер Днепрапятроўская вобл.). У снежні 1914 г. быў прызваны ў царскую армію на балтыйскі флот. У Кранштаце скончыў машынную школу і быў накіраваны машыністам на мінаносец "Канстанцін". Тут яго напаткала Кастрычніцкая рэвалюцыя. Каманда "Канстанціна" адразу на бок рэвалюцыі. Разам з матросамі ён прымаў удзел у разбраенні афіцэраў. Пасля рэвалюцыі прыехаў у Мсціслаў і прыняў удзел сумесна з прыбыўшымі ў горад салдатамі-франтавікамі і матросамі ў разбраенні гарадавых і жандармаў, разгоне эсэра-меньшавіцкага Савета. Змая 1918 г. працаваў у губернскім ваенным камісарыяце пры каменданцкім упраўленні памочнікам каменданта. А пасля вызвалення Гомеля ў 1919 г. быў накіраваны туды і працаў сувязным па асобых даручэннях. У 1922 г. прыехаў у родны Мсціслаў і працаваў качагарам, машыністам першай раёнай электрастанцыі. Пасля заканчэння шасцімесячных курсаў пры БСХА (г. Горкі Магілёўскай вобл.) у 1931 г. быў прызначаны брыгадзірам трактарнай брыгады, затым механікам Мсціслаўскай МТС. У перыяд Вялікай Айчыннай вайны працаваў на ваеным заводзе ў Маскве. Пасля вызвалення раёна ад нямецкіх акупантаў у 1944 г. вярнуўся на радзіму і працаваў дырэктарам Мсціслаўскай МТС. Узнагароджаны медалём "За баявыя заслугі", "За перамогу над Германіяй". З 1957 г. знаходзіўся на пенсіі, жыў у г. Мсціславе. Памёр 31 сакавіка 1979

**Літаратура:**

Батай Уладзімір Васільевіч // Памяць: Мсціслаўскі раён: Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі.–Мінск, 1999.–С. 112–113.

## 95 год з дня нараджэння Бліннікава Сямёна Мацвеевіча, Героя Сацыялістычнай працы

**Бліннікаў Сямён Мацвеевіч**нарадзіўся 24 снежня 1928 г. у в. Камароўка Крычаўскага раёна ў сям'і рабочых. Пасля заканчэння сямігодкі ў 1944 г. пачаў працоўную дзейнасць пуцявым рабочым у Крычаўскай дыстанцыі пуці на станцыі Асавец. З 1948 г. па 1951 г. служыў у Савецкай Арміі памочнікам камандзіра чыгуначных войск. Пасля звальнення ў запас працаваў старшым рабочым пуці на ранейшым месцы. У 1953 г. скончыў аднагадовую Шчорскую тэхнічную школу і быў прызначаны брыгадзірам чыгуначнага пуці на станцыі Ходасы Мсціслаўскага раёна. З 1956 г. працаваў майстрам пуці. Яму двойчы прысвойвалі званне "Лепшы дарожны майстар". Займаючы пасаду дарожнага майстра, завочна ў 1968 г. скончыў Брэсцкі тэхнікум чыгуначнага транспарту.

З 1973 г. больш 15 гадоў працаваў начальнікам участка пуці напрамка Орша – Крычаў.

У 1966 г. за ўзорнае ўтрыманне пуцявой гаспадаркі, умелую арганізацыю працы ў калектыве ўзнагароджаны ордэнам Леніна. У 1971г. прысвоена ганаровае званне "Заслужаны работнік транспарту БеларускайССР",узнагароджаны знакам "Ганаровы чыгуначнік", медалём "За працоўную доблесць".

**Літаратура:**

Блліннікаў Сямён Мацвеевіч: Узнагароджаны ордэнам Леніна// Памяць: Мсціслаўскі р-н: Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі.–Мінск, 1999.–С. 501, 515.

## 75 год з дня нараджэння Бубнава Генадзя Фёдаравіча, рускага савецкага паэта, перакладчыка

**Бубнаў Генадзь Фёдаравіч** нарадзіўся 09.05.1948 г. у вёскі Целяткава Мсціслаўскага раёна. Рускі савецкі паэт, перакладчык. Скончыў у 1972 г. Маскоўскі універсітэт. Працаваў на беларускім радыё, з 1975 г. у часопісе "Нёман". Друкуецца з 1963 г. Аўтар зборніка вершаў і паэм "Знітаванасць", «Связующая нить», (1975), "Жытнёвы поўдзень" (1978).

Асноўная тэматыка яго паэзіі – свет вясковага чалавека. На рускую мову пераклаў "Першую кнігу" І. Мележа ("Нёман" 1980, № 1, 2), асобныя вершы Я. Купалы, П. Панчанкі, Р. Барадуліна і інш.

**Літаратура:**

**Аб жыцці і творчасці:**

Бубнаў Генадзь Фёдаравіч// Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі. – 1984. – Т. 1. – С. 503.

Бубнаў Г. Беларускія пісьменнікі: біябліяграфічны слоўнік :[у 6 т.]. – Мінск, 1992. – Т. 1. – С. 368–369.

Бубнаў Генадзь Фёдаравіч// Пісьменнікі Магілёўшчыны: бібліяграфічны паказальнік;[складальнікі Новікава Н.А., Катлёнак А.А.]– Магілёў, 1993.–С. 20–21.

**Творы і рэцэнзіі на іх:**

Вещий камень: Баллады и поэма.–Минск, 1978.–86 с.

Ржаной полдень: Стихи и поэма.–Минск, 1978.–63 с.

Связующая нить.–Минск, 1975.–80 с.–(Первая книга поэта).

Рэцензія : Аврутин, А. Все ритмы земли родной/ А. Аврутин // Нёман.– 1975.–№8.– С. 174–176.

Волгин, И. Новый мир.–1976.–12 марта.

**140 год з дня нараджэння мовазнаўца,**
**Бялькевіча Івана Кандратавіча,**

**Бялькевіч Іван Кандратавіч**нарадзіўся 6 сакавіка 1883 г. у в. Варонічы Слонімскага павета Гродзенскай губерні. Беларускі мовазнавец.

Скончыў Свіслацкую настаўніцкую семінарыю (1902), Беларускі дзяржаўны ўніверсытэт (1925). Працаваў настаўнікам, інспектарам Наркамата асветы БССР (1920-1925), дырэктарам Мсціслаўскага педагагічнага тэхнікума (1925-1927), навуковым супрацоўнікам Інбелкульта, потым Інстытута мовазнаўства АН БССР. З 1930 г. працаваў у РСФСР і на Украіне. Аўтар артыкулаў па беларускаму мовазнаўству “Краёвага слоўніка ўсходняй Магілёўшчыны” (1970), які з’яўляецца самым поўным зборам усходняй беларускай дыялектычнай лексікі, зарэгістраванай у савецкі перыяд. У слоўніку каля 20 тысяч слоў (з тлумачэннем значэнняў, ілюстрацыямі і прыкладамі), запісаных у 20-ыя гады ў 376 населеных пунктах былой Калiненскай акругі і 31 населеным пункце суседніх раёнаў.

Арыштаваны 17 лютага 1930 г. па безпадстаўным абвінавачванні ў нацыяналізме. Па пастанове Калегіі АДПУ БССР ад 10 красавіка высланы ў Іашкар-Алу тэрмінам на 5 гадоў. Рэабілітаваны 19 верасня 1960 г. Вярхоўным судом БССР.

Памёр 18 кастрычніка 1960 г.

**Літаратура:**

Бялькевіч Іван Кандратавіч // Памяць: Мсціслаўскі раён: Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі. – Мінск, 1999.–С. 519.

Беларуская энцыклапедыя : [у 18 т.] ;[рэдактар Г. П. Пашкоў]. – Мінск, 1996. – Т. 3. – С. 403.

Гліннік, А. Іван Бялькевіч / А. Гліннік // Роднае слова. – 1993. – № 3. – С. 44.

Трухан, Т. Даследчык мовы / Т. Трухан // Звязда. – 1983. – 25 сакавіка.

## 90 год з дня нараджэння Валодзькіна Уладзіміра Іосіфавіча, Героя Сацыялістычнай працы



**Валодзькін Уладзімір Іосіфавіч** нарадзіўся ў 1933 г. у в. Капачы Мсціслаўскага раёна ў сям'і калгасніка. У 1948 г. скончыў 7 класаў Капачоўскай сярэдняй школы. Працоўную дзейнасць пачаў у 1949 г. рабочым саўгаса "Пісараўшчына". У 1954 г. скончыў Мсціслаўскае вучылішча механізацыі сельскай гаспадаркі і быў прызваны ў Савецкую Армію. Скончыўшы палкавую школу сяржантаў, служыў механікам-вадзіцелем танка. Пасля звальнення ў запас ў 1957 г. працаваў трактарыстам, камбайнёрам саўгаса "Пісарыўшчына". З 1971 г. – брыгадзір трактарнай брыгады, з 1973 г. – трактарыст.

У 1973 г. за поспехі і праяўленую доблесць у выкананні прынятых абавязацельстваў па павелічэнні вытворчасці і продажу дзяржаве збожжа, бульбы і іншых прадуктаў земляробства ўзнагароджаны ордэнам Леніна.

**Літаратура:**

Валодзькін Уладзімір Іосіфавіч: Узнагароджаны ордэнам Леніна// Памяць: Мсціслаўскі раён: Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі. – Мінск, 1999. – С. 501–502.

## 120 год з дня нараджэння Галушкевіча Сяргея Сяргеевіча, доктара тэхнічных навук

**Галушкевіч Сяргей Сяргеевіч** нарадзіўся 13 ліпеня 1903 г. у Мсціславе. Доктар тэхнічных навук, інжынер – палкоўнік. З сям'і служачых.

Скончыў сярэднюю школу ў Мсціславе (1912), Ленінградскі політэхнічны інстытут па спецыяльнасці інжынер–будаўнік (1930). У час вучобы (1922-1927) працаваў выкладчыкам школы ФЗН на Пуцілаўскім заводзе, тэхнікам, з 1927 па 1934 г.старшым інжынерам, загадчыкам канструктарскага і праектнага бюро, затым інжынерам грамадзянбуда,

выкладчыкам Політэхнічнага інстытута інжынераў шляхоў зносін і гідратэхнічнага інстытута. З 1934 па 1936 г. начальнік групы “Жалезабетонныя канструкцыі ” ў Ленінградскім інстытуце збудаванняў. З 1937 па 1941 г. кансультант Ленінградскага аддзялення трэста глыбінных работ і Будспецтрэста.

З пачатку вайны працаваў у Ленінградзе экспертам камісіі па абследванні і ўхіленні пашкоджванняў памяшканняў, выкліканых паветрынамі налётамі нямецкай авіяцыі. Са студзеня 1942 г. па загаду Ваеннага Савета Ленінградскага фронту прызначаны памочнікам начальніка па будаўніцтву лядовай трасы праз Ладажскае возера. З сакавіка 1942 г. – на выкладчыцкай рабоце ў вышэйшым інжынерна–тэхнічным вучылішчы ВМФ, з 1944 г. начальнік кафедры жалезабетонных канструкцый. З 1945 па 1956 г. – загадчык кафедры Ленінградскага політэхнічнага інстытута. Мае 26 навуковых даследванняў па будаўнічай механіцы.

Узнагароджаны медалямі“За абарону Ленінграда”, “За перамогу над Германіяй”, “30 год Савецкай Арміі”.

Памёр 2 чэрвеня 1956 г.

**Літаратура:**

Галушкевіч Сяргей Сяргеевіч: Знакамітыя людзі// Памяць: Мсціслаўскі раён: Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі. – Мінск, 1999. – С. 521.

## 125 год з дня нараджэння Галушкевіча Уладзіміра Сяргеевіча, Героя Сацыялістычнай працы



**Галушкевіч Уладзімір Сяргеевіч** нарадзіўся 2 студзеня 1898 г. у Мсціславе ў сям’і служачага. Удзельнік 1-ай сусветнай, грамадзянскай, Вялікай Айчыннай войнаў, генерал-лейтэнант(27.04.1962).

Скончыў Мсціслаўскую мужчынскую гімназію (1916), Маскоўскія артылерыйскія курсы (1920), артылерыйскія курсы ўдасканалення камсаставу РСЧА (1926), Ваенную акадэмію імя М.В. Фрунзе (1931), Ваенную акадэмію Генеральнага штаба з адзнакай (1954).

З 1916 г. у царскай арміі ў запасной марской брыгадзе, 27-ым марцірным дывізіёне на Заходнім фронце – малодшы афіцэр, прапаршчык армейскай артылерыі. З лютага 1918 г. у 3-ім Магілёўскім атрадзе Чырвонай гвардыі – камандзір батарэі.

Ваяваў на заходнім фронце з польскім корпусам Доўбар-Мусніцкага ў раёне Рагачова, Нова-Быхава, Магілёва (люты – май 1918 г.) цяжка паранены і кантужаны пад Лупалавам. Пасля доўгага лячэння працягваў службу ў

Магілёўскім і Мсціслаўскім ваенкаматах. У саставе 17-ай стралковай дывізіі ваяваў з белапалякамі на Заходнім фронце ў раёне Мінска, Пружан, Слуцка.

Уліпені–верасні 1920 г. – камандзір батарэі. У саставе 3-ай стралковай дывізіі ваяваў супраць войск Урангеля на Паўднёвым фронце ў раёнах Васільеўкі, Папоўкі, Перакопа, Нова-Аляксандраўкі, Сіваша (верасень–снежань1920 г.).

Пасля грамадзянскай вайны з мая па снежань 1922 г. у складзе 4-ай асобнай брыгады курсантаў прымаў удзел у ліквідацыі "бела-зялёных" банд у Крымскіх гарах у якасці памочніка начальніка штаба.

З 1923 г. служыў у Чырвонай Арміі ў артылерыйскіх часцях: памочнікам камбата, камандзірам батарэі, начальнікам штаба артылерыі Прыморскага ўмацаванага раёна, з 1934 г. начальнікам аддзела штаба Асобай Чырвонасцяжнай Далёкаўсходняй Арміі (АЧДУА), з 1936 г. памочнікам начальніка і начальнікам Генштаба Рабоча-селянскай Чырвонай Арміі (РСЧА).

С 1938 г. працаваў у Ваеннай акадэміі імя М.В. Фрунзе старшым выкладчыкам армейскай аперацыі, начальнікам навукова-даследчага аддзела. 1939 г. яму прысвоена званне палкоўніка, камбрыга.

Удзельнік савецка-фінляндскай вайны: начальнік аддзела штаба 13-ай Арміі Паўночна-Заходняга фронту. За баявыя дзеянні ўзнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга. У 1940 г. за навуковую і педагагічную дзейнасць прысвоена званне дацэнта без абароны дысертацыі. Меў тры навуковыя працы (1934, 1936, 1939). Ваенны перакладчык, свабодна валодаў французскай, нямецкай і лацінскай мовамі.

Службу праходзіў у паўночна-Каўказскай ваеннай акрузе, Прыморскім умацаваным раёне, Асобнай Чырвонасцяжнай Далёкаўсходняй Арміі, Маскоўскай ваеннай акрузе.

З пачатку Вялікай Айчыннай вайны з чэрвеня 1941 г. – на Цэнтральным, Заходнім франтах: начальнік аператыўнага аддзела, намеснік начальніка штаба фронту (генерал-маёр, 02.01.1942 г.), прымаў непасрэдны ўдзел у падрыхтоўцы і ажыццяўленні контрнаступлення савецкіх войск пад Масквой.

Некаторы час знаходзіўся ў распаражэнні ГУК Міністэрства абароны СССР.

Пасля заканчэння Ваеннай Акадэміі Генеральнага штаба ён з 1954 г. першы намеснік начальніка штаба Кіеўскай ваеннай акругі.

У 1955 – 1964 гг. працаваў у Генеральным штабе Узброенных Сіл СССР намеснікам і начальнікам навуковага ўпраўлення. Унёс вялікі ўклад у распрацоўку ваеннай тэорыі і гісторыі.

Узнагароджаны ордэнам Леніна, трыма ордэнамі Чырвонага Сцяга, медалямі. Жыў у Маскве. Памёр 9 лютага 1964 г.

**Літаратура:**

Гасянкоў, У.Л. Галушкевіч Уладзімір Сяргеевіч/ У.Л. Гасянкоў// Памяць: Мсціслаўскі раён: Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі.–Мінск, 1999.– С. 260–261.

## 130 год з дня нараджэння літаратуразнаўца, крытыка, фальклорыста, лексікографа, Гарэцкага Максіма Іванавіча



**Гарэцкі МаксімІванавіч** нарадзіўся 18 лютага 1893 г. у вёскі Малая Багацькаўка Мсціслаўскага павета ў сялянскай сям'і. Беларускі пісьменнік, адзін з пачынальнікаў нацыянальнай прозы, літаратуразнавец, крытык, фалькларыст, лексікограф. Псеўданімы: М.Б. Беларус, Максім Беларус, М. Г., А. Мсціслаўскі, Дзед Кузьма, Мацей Мышка, Мізэрыўс Монус.

У 1913 г. скончыў Горацкае каморніцка-агранамічнае вучылішча, у 1916 г. – Паўлаўскае вучылішча ў Петраградзе. У 1913 – 1914 гг. працаваў каморнікам на Віленшчыне. У першую сусветную вайну – на фронце, быў цяжка паранены. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі працаваў у гарадскім Савеце Смаленска, супрацоўнічаў у "Известиях Смоленского Совета", газеце "Звязда", з рэдакцыяй якой у пачатку 1919 г. пераехаў у Вільню. Рэдактар-выдавец газеты "Беларускія ведамасці". Меў сувязі з віленскімі камуністамі, за што ў 1922 г. пасаджаны ў Лукішскую турму.

З кастрычніка 1923 г. у БССР выкладаў беларускую мову і літаратуру на рабфаку БДУ, у Камуністычнам універсітэце Беларусі, Мінскім ветэрынарным тэхнікуме, Горацкай сельскагаспадарчай акдэміі. З 1928 г. вёў даследчую работу ў Інбелкульце і АН Беларусі. З 1931 г. – у Вятцы (Кіраў), з 1935 г. – выкладчык рускай мовы і літаратуры ў г.п. Пясочная (Кіраў, Калужскай вобл.).

З самага пачатку творчай дзейнасці М. Гарэцкі цікавіўся праблемамі нацыянальнага адраджэння, фарміравання беларускай мовы, народнай асветы, тэатра літаратуры. Звяртаючыся да пісьменнікаў, М.Гарэцкі раіў ім прыслухоўвацца да мовы народа.

Любоў да народна-дыялектнай мовы ішла да М. Гарэцкага ад самога жыцця, ад любові да свайго краю, Радзімы. Рознага роду дыяліктызмы разам з агульнанароднымі словамі і словаформамі ствараюць натуральнасць, праўдзівасць, непаўторны каларыт у кожным творы пісьменніка, развіваюць варыянтнасць і сінаніміку беларускай літаратурнай мовы.

У 1938 г. арыштаваны. Расстраляны 10 лютага 1938 г. у Вязьме. Справа па абвінавачванні М. Гарэцкага адменена і спынена ў 1957 г. Вярхоўным судом БССР. 07.02.1959 г. Калужскім абласным судом поўнасцю рэабілітаваны.

Друкаваўся з 1912 г. (допісы, карэспандэнцыі, фельетоны) у газеце “Наша ніва”, у якой 25 студзеня 1913 г. змясціў першае апавяданне “У лазні”. Першы зборнік апавяданняў “Рунь” выйшаў у Вільні ў 1914 г. Аўтар драматызаванай аповесці “Антон” (1914 г., апубл. 1919 г.) ужо ў дакастрычніцкі перыяд пісьменнік узбагаціў нашу літаратуру складанай грамадска-сацыяльнай і філасофскай праблематыкай, вялікай духоўна-інтэлектуальнай змястоўнасцю. Пачатак дакументальнага жанру ў беларускай літаратуры 20 ст. паклала кніга дакументальна-мастацкіх запісак “На імперыялістычнай вайне” (1915–1919 гг., апубл. 1926 г.), дзе Гарэцкі, надаўшы сваім асабістым уражанням ваеннага часу форму салдацкага дзённіка, з вялікай глыбінёй, суровай і мужнай праўдзівасцю паказаў грабежніцкую сутнасць вайны. Антываенны характар маюць і апавяданні “Літоўскі хутарок” і “Рускі” (1915), “Генерал” і “На этапе” (1916). Рэчаіснасць напярэдадні імперыялістычнай вайны адлюстравана ў аўтабіяграфічнай аповесці “Меланхолія” (пач. 20-ых гг.). У зборніку апавяданняў “Досвіткі” (1926) М. Гарэцкі звярнуўся да адлюстравання гістарычнага мінулага Беларусі. Падзеі рэвалюцыі і грамадзянскай вайны паказаны ў аповесці “Дзве душы” (1919). У драматычных абразках “Чырвоныя ружы” (1922) паказаны рост рэвалюцыйных настрояў працоўных мас. Гістарычная эпоха ад часоў прыгону да 1-ай чвэрці 20 ст. адлюстравана ў рамане “Віленскія камунары” (1931–1932 гг., апубл. 1963 г.). На дакументальным і аўтабіяграфічным матэрыяле створаны раман “Камароўская хроніка” (1930–1932, 1937). Напісана з выкарыстаннем летапіснай традыцыі (Баркалабаўская хроніка і інш.). Збіраў і вывучаў беларускі фальклор (зб. “Народныя песні з мелодыямі”, 1928 г., з А. Ягоравым). Аўтар “Гісторыі беларускае літаратуры” (Вільня, 1920 г.), “Хрэстаматыі беларускае літаратуры. 11 век – 1905 г.” (Вільня, 1922 г.), шматлікіх літаратутразнаўчых і крытычных артыкулаў, слоўнікаў “Руска-беларускі слоўнік” (Смаленск, 1918 г.; 2-ое выд., Вільня, 1920 г.) і інш. На беларускую мову пераклаў асобныя працы У.І. Леніна, творы М. Горкага, А. Фадзеева, Ю. Лібядзінскага, У. Арсеньева. Кнігі Гарэцкага выдадзены на рускай, украінскай, літоўскай, латышскай, польскай, нямецкай мовах.

**Літаратура:**

**Асноўныя навуковыя працы:**

Беларуска-расійскі слоўнічак. Белорусско-русский словарик.–Выданне 3-е, перароблена́е.–Масква, 1925.

Гарэцкі М., Дзяржынскі У., Каравай П. Выпісы з беларускай літаратуры. Ч.1.–Мінск, 1926.–303 с.

Выступленне на ўрачыстым адкрыцці Акадэмічнай канферэнцыі // Працы Акадэміі канф. па рэформе беларускага правапісу і азбукі. – Мінск, 1927.–С. 32–34.

Гісторыя беларускай літаратуры.–Выданне 4-е.–Мінск, 1926.–225 с.

Доктар Францыск Скарына // Вольная Беларусь.–1917.–6 жніўня.

Колькі слоў аб творах і мове М. Лынькова // Маладняк.–1928.–№ 6.–С. 111–118.

Маскоўска-беларускі слоўнік.–Выданне 2 (з папраўкамі і вялікімі дададкамі).–Вільня, 1921.–144 с.

Мастацкая проза сучасных маладнякоўцаў // “Маладняк” за пяць гадоў: 1923–1928.–Мінск, 1928.–С. 46–58.

Невялічкі Беларуска-маскоўскі слоўнік.–Выданне 2-е.–Вільня, 1921.–261 с.

Байкоў М., Гарэцкі М. Практычны расійска-беларускі слоўнік.–Мінск, 1924.–261 с.

Руска-беларускі слоўнік.–Смаленск, 1918.–112 с.

Беларускае мовазнаўства: бібліяграфічны указальнік (1825–1965); складальнік А.Д. Васілеўская і іншыя.

Беларуская этнаграфія і фалькларыстыка: бібліяграфічны паказальнік(1945–1970); складальнік М.Я. Грынблат.–Мінск, 1972.–388 с.

Бібліяграфічны указальнік літаратуры па беларускаму мовазнаўству; склалі М.А. Жыдовіч, Я.М. Рамановіч, А.К. Юрэвіч.–Мінск, 1960.–221 с.

**Аб жыцці, творчасці і навуковай дзейнасці:**

Гарэцкі М.І. // БелСЭ :у 12 т.–Мінск, 1971.–Т. 3. – С.374.

Гарэцкі М.І. // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у5 т.–Мінск, 1985.–Т. 2. – С. 55–56.

Гарэцкі М.І. // Беларускаямова:энцыклапедыя.–Мінск, 1994.–С.123–125.

Гарэцкі Максім// Беларускія пісьменнікі: біябібліяграфічны слоўнік :[у 6 т.].–Мінск, 1993.–Т. 2. – С. 148–155.

Гарэцкі Максім Іванавіч// Бібліяграфічны паказальнік ;складальнікі Новікава Н.А., Катлёнак А.А.–Магілёў, 1993.–С. 3, 42–47, 205.

Гарэцкі Максім Іванавіч: Знакамітыя людзі// Памяць: Мсціслаўскі раён: Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі.–Мінск, 1999.–С. 522–523.

Максім Гарэцкі// Пісьменнікі Савецкай Беларусі: кароткі даведнік.–Мінск, 1981.–С. 86–87.

Аўтабіяграфія // Пра час і пра сябе.–Мінск, 1966.–С. 94–95.

Максим Иванович Горецкий (1893–1939)// Антология педагогической мысли Белорусской ССР.–Москва, 1986.–С. 346–354.

Абабурка, М.В. Асаблівасці выкарыстання моўна-выяўленчых сродкаў ў творах М. Гарэцкага/ М.В. Абабурка// Гарэцкія чытанні:тэзісны даклад.–Горкі, 1993.–С. 13–18.

Абабурка, М. Мова Максіма Гарэцкага/ М. Абабурка// Магілёўская праўда.–1992.–22 студзеня.

Абабурка, М. Мова твораў Максіма Гарэцкага/ М. Абабурка// Роднае слова.–1993.–№ 7.–С. 30–33.

Абрамава, Я. Функцыі антрапонімаў у аповесці М. Гарэцкага “Дзве душы” / Я. Абрамава // Гарэцкія чытанні : матэрыалы дакладаў і паведамленнеў1-х міжнародных чытанняў.–Мінск, 1997.–С. 232–235.

Агаркава, В. А народ мой – народ лірнік:М. Гарэцкаму–100/ В. Агаркава // ЛіМ.–1992.–11 снежня.–С. 4.

Адамовіч, А. «Браму скарбаў сваіх адчыняю…»:пра творчасць М. Гарэцкага/ А. Адамовіч // Полымя.–1975.–№8.–С. 217–235; № 9.–С. 207–226; № 10.–С. 187–212; № 11.–С. 202–241.

Акуленка, Л. Роднае карэнне Гарэцкага : як яго творы вучаць дзяцей любіць радзіму / Л.Акуленка // Звязда. – 2013. – № 45. –12 сакавіка. – С.5.

Акуленка, Л. Шлях Максіма Гарэцкага да “Скарбаў жыцця” : да 120-годдзя з дня нараджэння Максіма Гарэцкага / Людміла Акуленка // Святло Кастрычніка. – 2013. – №37. – 22 мая. – С.5.

Антонава, С.М. Дзеясловы маўлення ў рамане Максіма Гарэцкага “Віленскія камунары” : лексічная прадстаўленасць, семантыка, спалучальнасць / аўтары: С.М. Антонава, І.С. Лісоўская // Гарэцкія чытанні. – Горкі, 1993. – С. 18–23.

Атрашкевіч, В.І. Аб жанравых асаблівасцях запісак М. Гарэцкага “На імперыялістычнай вайне” / В.І. Атрашкевіч // Беларуская літаратура. – 1984. – Вып. 12. – С. 73–80.

Бальшакова, Ю. Два лёсы братоў Гарэцкіх : [Гаўрылу ад расстрэлу выратавала рашэнне Сталіна, а Максіму пазбегнуць знішчальнай машыны рэпрэсій не пашчасціла] / Юлія Бальшакова // Сельская газета. – 2014. – № 7. – 21 января. – С.7.

Барысюк, У.У. Лексіка-марфалагічныя варыянты назоўнікаў у творах Максіма Гарэцкага / У.У. Барысюк // Гарэцкія чытанні. –Горкі, 1993. – С. 30–32.

Брыль, Я. После букваря: о М. Горецком/ Я. Брыль// Брыль, Я. Немного о вечном/ Я. Брыль.–Москва, 1983.–С. 253–262.

Бугаёў, Д.Я. Максім Гарэцкі/ Д.Я. Бугаёў.–Мінск, 1968.–163 с.: іл.

Бугаёў, Д. Самаадданнае служэнне бацькаўшчыне: пра Максіма Гарэцкага і яго наватарскую ролю ў гісторыі беларускай літаратуры]/Д. Бугаёў// Бугаёў Д. Чалавечнасць: літаратурны крытык.–Мінск, 1975.–С. 4–50.

Булахов, М.Г. Горецкий М.И./ М.Г. Булахов// Булахов, М.Г. Восточнославянские языковедцы: библиографический словарь/ М.Г. Булахов.–Минск, 1977.– Т.2. – С.5. – С. 157–158.

Бярозка, Ул. Волаты духу:гісторыя напісання рамана-хронікі

“Віленскія камунары” М. Гарэцкім/ Ул. Бярозка // Віцебскі рабочы.–1991.–11 кастрычніка.

В память о классике:в Кирове Калужской области открыли мемориальную доску классику белорусской литературы М. Горецкому // Святло Кастрычніка. – 2013. – №45. – 19 чэрвеня. – С.4.

“Ва імя святога ўсім нараджэння”: аб зборнікетвораў М. Гарэцкага// ЛіМ.–1991.–13 верасня–С. 7.

Гарэцкі, Г. Успаміны пра брата/ Г. Гарэцкі // Полымя.–1963.–№ 2.–С. 177–182.

Гарэцкі М. (1893–1939): жыццёвы і творчы шлях пісьменніка// Лойка, А.А. Гісторыя беларускай літаратуры: дакастрычніцкі перыяд. Ч.2/ А.А. Лойка.–Мінск, 1980.–С. 357–434.

Гарэцкі, Р. Растрэл Максіма Гарэцкага/ Р. Гарэцкі// ЛіМ.–1992.–9 кастрычніка.–С. 14–15; 16 кастрычніка.–С. 14–15.

Гарэцкі, П. Якім я помню свайго брата (М. Гарэцкага)/ П. Гарэцкі// Полымя.–1983.–№2.–С. 207.

Гаўрук, Ю. Сустрэчы ў Горках і Мінску:успаміны пра М. Гарэцкага/ Ю. Гаўрук// Гаўрук Ю. Ступень адказнасці: літаратурна-крытычныя артыкулы, эсэ/ Ю. Гаўрук.–Мінск, 1986.–С. 131–134.

Германовіч, І.К. Максім Гарэцкі як мовазнавец/ І.К. Германовіч// Веснік БДУ. Серыя 4.–1993.–№1.– С. 43–49.

Гніламёдаў, У. Максім Гарэцкі/ У. Гніламёдаў// Гніламёдаў, У. Класікі і сучаснікі/ У. Гніламёдаў.–Мінск, 1987.–С. 58–66.

Голуб, Т. “А вы зірніце на жывое...”: М. Гарэцкі і дзеці/ Т. Голуб// ЛіМ.–1992.–3 красавіка.–С. 6–7.

Губская, О. Братья Горецкие: «Цель жизни сделать наш народ богатым»: беседа с племянником М.Горецкого Радимом Гавриловичем Горецким / О.Губская // АиФ. – 2013. – №8. – С.34. – 20 февраля.

Губская, В. Тэксты Максіма Гарэцкага на старонках “Нашай нівы” праз прызму ўспрымання журналістыкі / Вольга Губская // Полымя. – 2016. – № 11. – С. 119–126.

Губская, О. Жизнь, воплощенная в слове: о романе М.Горецкого «Виленские коммунары» / О.Губская // Нёман. – 2013. – №2. – С.144–158.

Данільчык, З.П. З назіранняў над сінтаксічнай роляй інфінітыва ў апавяданнях М. Гарэцкага/ З.П. Данільчык // Гарэцкія чытанні : матэрыялы дакладаў і паведамленнеў. – Мінск. – 1996. – С. 68–74.

Дасаева, Т. Летапіс жыцця і творчасці М. Гарэцкага / Т. Дасаева // Маладосць. – 1983. – № 2. – С. 147–162.

Дзянісаў, У.С. Праблемы вывучэння эпітэта і яго роля ў творах М. Гарэцкага / У.С. Дзянісаў // Гарэцкія чытанні. – Горкі, 1993. – С. 48–52.

Дубавец, С. Арэол для Максіма Гарэцкага / С. Дубавец // Дубавец, С. Практыкаванні : проза, эсэ, крытыка / С. Дубавец. – Мінск, 1992. – С. 207–220.

Дэконская, В. Максім Гарэцкі “Віленскія камунары”/ В. Дэконская//

Полымя.–1984. –№9.–С. 195–200.

Запартыко, А. «Памятник может быть и архивным»:к 120-летию М.Горецкого / Анна Запартыко // Нёман. – 2013. – №4. – С.166–171.

Зарэмба, Л. Я. Купала і М. Гарэцкі – перакладчыкі “Слова аб палку Ігаравым”/ Л.Зарэмба// Полымя.–1985.–№ 4.–С. 207–214.

Іофе, Э. “Вучыў нас тата...” : метады выхавання пісьменніка М. Гарэцкага/ Э. Іоффе// Настаўніцкая газета.–1990.–8 снежня.

Каляда, К. Марыў пра незалежную і шчаслівую Беларусь: да дня нараджэння Максіма Гарэцкага / К. Каляда // Святло Кастрычіка. – 2014. – № 12.– 15 лютага. – С.2.

Каляда, К. Пісьменнік і навукоўца: да дня нараджэння Максіма Гарэцкага / К. Каляда // Святло Кастрычніка. – 2015. – № 7. – 28 студзеня. – С.6.

Каляда, К. Пісьменнік і навукоўца: да дня нараджэння Максіма Гарэцкага / Крысціна Каляда // Могилевские ведомости. – 2015. – № 14. – 20 февраля. – С.21.

Каляда, Х.Скарбы яго жыцця : 18 лютага – дзень нараджэння Максіма Гарэцкага / Хрысціна Каляда // Могилевские ведомости. – 2016. – № 12. – 16 февраля. – С. 12.

Карп, А. Літаратурная крытака Максіма Гарэцкага: канцэпцыя і рэалізацыя / Алена Карп // Полымя. – 2016. – № 1. – С.135–141.

Касцянкова, Т. Вялікі чалавек з Малой Багацькаўкі :да 120-годдзя М.Гарэцкага / Т.Касцянкова // Святло Кастрычніка (Мсціслаў). – 2013. – № 13. – С.3. – 16 лютага.

Квяткоўская, С. Невядомы Максім Гарэцкі : у цэнтральнай раеннай бібліятэцы адкрылася тэматычная выстава, прысвечаная 125-годдзю з дня нараджэння Максіма Гарэцкага “Шляхам служэння Беларусі” / Святлана Квяткоўская // Святло кастрычніка. – 2018. – № 9. – 3 лютага. – С. 3.

Караткоў, М.М. Аб эвалюцыі сацыяльных і эстэтычных поглядаў М. Гарэцкага / М.М. Караткоў // Весці АН БССР. Серыя грамадскіх навук. – 1983. – № 1. – С. 89–94.

Клімуць, Я. Шчасліва-трагічны лёс пісьменніка :18 лютага – 120 гадоў з дня нараджэння М.Гарэцкага / Я.Клімуць // Могилевские ведомости. – 2013. – № 12. – С.6.

Краўцова, В. На радзіме памятаюць і ганарацца земляком : Мсціслаўшчыну наведаў Радзім Гаўрылавіч Гарэцкі. Племяннік М. Гарэцкага / В.Краўцова // Святло Кастрычніка. – 2013. – № 46. – 22 чэрвеня. – С.3.

Лебедзеў, У.А. Аб некаторых тэндэнцыях рамантызацыі ў прозе Максіма Гарэцкага 20-х гадоў / У.А. Лебедзеў // Беларуская літаратура. – 1983. – Вып.11. – С. 50–58.

Ліс, М., Жук, Т. Самабытны мастак слова: да 120-годдзя з дня нараджэння М.Гарэцкага / М.Ліс, Т.Жук // Веды. – 2013. – №8. – С. 8. – 18 лютага.

Лужанін, М. Духоўная апантанасць : лёс М. Гарэцкага і яго рода / М.

Лужанін // ЛіМ. – 1991. – 17 мая. – С. 14–15.

Максім Гарэцкі: успаміны, артыкулы, дакументы/ Складальнік А.С. Ліс., І.У. Саламевіч.–Мінск, 1984.–С. 366.

Марціновіч, А. “Брама адчыненная ў вечнасць” :асобныя раздзелы з кнігі аўтара пра жыццё і творчасць М.Гарэцкага / А.Марціновіч // Полымя. – 2013. – № 1. – С.130–144. – № 2. – С.135–147.

Махоткін, Дз. На той далёкай, на імперыялістычнай : кніга М.Гарэцкага “На імперыялістычнай вайне” / Дзмітрый Махоткін // Рэспубліка. – 2014. – № 188. – 7 кастрычніка. – С. 16.

Мушынскі, М. Вяртанне класікі : пра аднатомнік апавяданняў М. Гарэцкага / М. Мушынскі // ЛіМ. – 1989. – 31 сакавіка. – С. 5.

Мушынскі, М. Грамадзянін, мастак, вучоны : М. Гарэцкі / М. Мушынскі // Маладосць. –1983. – № 2. – С. 162–165.

Мушынскі, М. Максім Гарэцкі – крытык і гісторык літаратуры / М. Мушынскі // Полымя. – 1984. – № 1. – С. 197–209.

Мушынскі, М. “Шукайце брату свайму дарогу да праўды...”: Публіцыстычная і літаратурна-крытычная спадчына М. Гарэцкага / М. Мушынскі // Полымя. – 1990. – № 1. – С. 177–190.

Мышкавец, І. “Праглядзіце гэты томік…” : да 100-годдзя “Вянка” М.Багдановіча / І.Мышкавец // ЛіМ. – 2013. – №10. – С. 10. – 7 сакавіка.

На той далёкай вайне:кніга М.Гарэцкага “На імперыялістычнай вайне” // Святло Кастрычніка. – 2014. – №91. – 8 кастрычніка. – С.1.

Новікава, Т. Ад жыцця, ад слова народнага:метадычныматэрыял для настаўнікаў/ Т. Новікава// Роднае слова.–1992.–№12.–С. 5–16.

Падашэўка, В. Памяці творцы : верш да 120-годдзя з дня нараджэння М.Гарэцкага / В.Падашэўка // ЛіМ. – 2013. – № 7. – С.1. – 15 лютага.

Падгайскі, Л. Жывая спадчына / Л. Падгайскі // Полымя. – 1969. – № 6. – С. 217–221.

Салаўева, Д. Вялікі зямляк з малой зямлі : Максім Іванавіч Гарэцкі / Дар’я Салаўева // Святло Кастрычніка. – 2017. – № 9. – 1 лютага. – С. 4.

Сачанка, Б. Другое нараджэнне:пра М. Гарэцкага/ Б. Сачанка// Маладосць.–1982.–№12.–С. 117–119.

Сідарэнка, Л. Падзвіжнік з Малой Багацькаўкі : да дня нараджэння М. Гарэцкага / Л. Сідарэнка //Святло Кастрычніка. – 2017. – № 13. – 13 лютага. – С. 5.

Скрыган, Я. Запавет: М. Гарэцкаму – 95/ Я. Скрыган // Беларусь.– 1988.–№2.–С. 26.

Стральцоў, М. З вялікай павагай: да 100-годдзя з дня нараджэння М. Гарэцкага/ М. Стральцоў// Святло Кастрыніка (Мсціслаў).–1992.–11 лістап.

Студзенка, Т. Класіку – адпаведны фармат : да 120-годдзя з дня нараджэння М.Гарэцкага / Т.Студзенка // ЛіМ. – 2013. – № 8. – С.2. – 22 лютага.

Танк, М. У истоков новой культуры: к 90-летию со дня рождения М. Горецкого/ М. Танк// Лит.газ.–1983.–4 мая.–С. 5.

Уласенка, Л. Брама, адчыненая ў вечнасць : [18 лютага – 125 год з дня нараджэння Максіма Гарэцкага] / Ларыса Уласенка // Святло кастрычніка. – 2018. – № 13. – 17 лютага. – С. 5.

Чарнякевіч, Ц. Максім Гарэцкі і метафізіка / Ц.Чарнякевіч // Маладосць. – 2013. – № 2. – С.106–108.

Што ў «Запавеце Максіма Беларуса»? :да 120-годдзя з дня нараджэння М. Гарэцкага // Культура. – 2013. – №8. – С. 14. – 23 лютага.

Юрчанка, Г. Даследванні беларускай літаратуры: Да 100-годдзя з дня нараджэння М. Гарэцкага/ Г. Юрчанка// СвятлоКастрычніка (Мсціслаў).— 1993.—20 студз.

Ярмоленка, А. Творчасць Максіма Гарэцкага ў літаратурна-крытычных артыкулах яго сучаснікаў / Алена Ярмоленка // Роднае слова. – 2014. – № 5. – С.15–17.

## 65 год з дня нараджэнняГасянковай Ірыны Уладзімераўны, кандыдата фізіка-матэматычных навук

**Гасянкова Ірына Уладзіміраўна** нарадзілася 2 студзеня 1958 г. у в. Гапонавічы Крупскага раёна Мінскай вобласці ў сям’і настаўнікаў. Вучоны ў галіне электронікі, старшы навуковы супрацоўнік Інстытута электронікі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі з 1996 г., кандыдат фізіка-матэматычных навук (1992).

Бацькі, выхадцы з Мсціслаўшчыны, у 1959 г. вярнуліся на радзіму ў Мсціслаў, дзе прайшло дзяцінства і юнацтва Ірыны Уладзімераўны. Тут у 1974 г. скончыла 10 класаў першай сярэдняй школы. У гэтым жа годзе паступіла ў Мінскі радыётэхнічны інстытут, а ў 1979 г. скончыла ўстанову з адзнакай па спецыяльнасці “Паўправаднікі і дыялектрыкі ”. Была накіравана на працу ў Навукова–Даследчы інсытут электронікі АН БССР у якасці інжынера электроннай тэхнікі. У 1984 г. па конкурсу была прынята ў аспірантуру пры інстытуце і ў 1987 г. скончыла яе з адзнакай па спецыяльнасці “Цвёрдацельная электроніка і мікраэлектроніка”.

З 1987 г. працуе малодшым навуковым супрацоўнікам, з 1991 г. – навуковым супрацоўнікам, з 1996 г. – старшым навуковым супрацоўнікам у Інстытуце электронікі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Апублікавала 43 навуковыя працы, мае 3 вынаходствы.

**Літаратура:**

Гасянкова Ірына Уладзіміраўна: Знакамітыя людзі// Памяць: Мсціслаўскі раён: Гістарычна-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі. – Мінск, 1999. – С. 524–525.

## 125 год з дня нараджэння Данілава Георгія Міхайлавіча, Героя Сацыялістычнай працы



Выбраны членам першага завадскога камітэта. На прадпрыемствах Нароўска-Пецяргофскага раёна вёў палітычную работу.Нарадзіўся ў 1898 г. у в. Нашкавічы Мсціслаўскага павета ў сялянскай сям'і. 14-гадовым падлеткам паехаў на заробкі. Працаваў грузчыкам на паперапрадзільнай фабрыцы, у Гур'еўскім порце, столерам і цесляром на заводзе акцыянернага таварыства. Удзельнік Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. на сходзе рабочых, дзе працаваў, быў моладзі, удзельнічаў у арганізацыі Сацыялістычнага Саюза Моладзі гэтага раёна. У перыяд Кастрычніцкай рэвалюцыі выконваў розныя даручэнні Ваенна-рэвалюцыйнага камітэта. У пачатку 1918 г. па заданні партыі прыехаў на Мсціслаўшчыну. Прымаў удзел у падрыхтоўцы першага павятовага з'езда Саветаў, які адбыўся 24 студзеня 1918 г. На гэтым з'ездзе быў выбраны членам паветвыканкама і прызначаны загадчыкам аддзела аховы здароўя. Узначальваў павятовую камісію па барацьбе з контрэвалюцыйнамі элементамі, камісіі па налажванню ўліку і кантролю канфіскованых памешчыцкіх маёнткаў у старасельскай воласці.

Г. М. Данілаў на сялянскіх сходах растлумачваў мэты Кастрычніцкай рэвалюцыі, ленінскі дэкрэт аб зямлі. У 1919–1923 гг. – у Чырвонай Арміі, на франтах грамадзянскай вайны вёў палітычную работу сярод чырвонаармейцаў. Пасля грамадзянскай вайны з 1924 г. працаваў у Мсціславе, Касцюковічах і Клімавічах народным суддзёй. З 1926 г. – на партыйнай рабоце ў Клімавіцкім і Магілёўскім акружкамах партыі. З 1930 г. у Маскве працаваў на кіруючай рабоце ў гарадской і абласной партыйных арганізацыях.

У гады Вялікай Айчыннай вайны – удзельнік партызанскага руху ў Падмаскоўі. Пасля вайны працаваў на партыйнай рабоце ў Маскве. Узнагароджаны васьмю ўрадавымі ўзнагародамі.

**Літаратура:**

Данілаў Георгій Міхайлавіч // Памяць: Мсціслаўскі раён: Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі.–Мінск, 1999.–С. 113–114.

## 135 год з дня нараджэння Дзянісава Міхаіла Аляксеевіча, удзельніка Кастрычніцкай рэвалюцыі

**Дзянісаў Міхаіл Аляксеевіч**нарадзіўся ў 1888 г. у г. Мсціславе ў сям'і беднага рамесніка. У 1914 г. быў прызваны ў царскую армію, дзе знаходзіўся па красавік 1917 г. Удзельнічаў у баях у складзе 165-га стралковага палка. У

арміі перайшоў на бок бальшавікоў. Пасля Лютаўскай рэвалюцыі М.А. Дзянісава выбралі членам ротнага камітэта.

Кастрычніцкую рэвалюцыю сустрэў у шпіталі, бо быў паранены. У канцы 1917 г. вярнуўся ў родны Мсціслаў.

М.А. Дзянісаў удзельнічаў у стварэнні камітэтаў вясковай беднаты, калектыўных гаспадарак, вёў барацьбу з кулакамі, эсэрамі і бандытамі, праводзіў у жыццё ленінскі Дэкрэт "Аб зямлі". Дэлегат 5 Усерасійскага з'езда Саветаў, узначальваў атрад рабочых тытунёвай фабрыкі па падаўленні леваэсэраўскага мяцяжу ў Маскве, дэлегат 3 Усерасійскага з'езда земаддзелаў ад Мсціслаўскага павета.Працаваў старшынёй Казімірава-Слабадскога валасного Савета, потым на кіруючых пасадах у Мсціславе.Тут пайшоў на заслужаны адпачынак. Апошнія гады жыў у г. Мінску.

**Літаратура:**

Дзянісаў Міхаіл Аляксеевіч: Удзельнікі Кастрычніцкай рэвалюцыі// Памяць: Мсціслаўскі раён: Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі. – Мінск, 1999. – С. 114.

## 85 год з дня нараджэння Ждана Алега, празаіка, Члена Саюза пісьменнікаў Беларусі



Сапраўднае імя Пушкін Алег Аляксеевіч – празаік, Член Саюза пісьменнікаў Беларусі, піша на рускай мове.

**Ждан Алег** нарадзіўся ў 1938 годзе ў сям'і настаўнікаў. Жыў і вучыўся ў г.Мсціславе. Скончыўшы дзесяцігодку ў 1955 годзе, паступіў на гісторыка-геаграфічны факультэт Магілёўскага педінстытута. Пасля яго заканчэння працаваў слесарам, інжынерам-дыспетчарам на будаўніцтве Карагандзінскага металургічнага камбіната з 1960 года па 1961, затым на Брацкім лесапрамысловым комплексе з 1961 па 1963. Там пачаў пісаць апавяданні. Першае з іх "Санька, Туся і брыгадзір" было апублікавана ў 1963 годзе ў штотыднёвіку "Литературная Россия". З 1963 года жыве ў Мінску. Працаваў на Мінскім трактарным заводзе з 1963 па 1972, затым два гады старшым рэдактарам Беларускага тэлебачання, з 1973 года па 1976 быў рэдактарам кінастудыі "Беларусьфільм". Завочна скончыў Літаратурны інстытут імя М.Горкага ў 1969 годзе, а таксама сцэнарнае аддзяленне Вышэйшых двухгадовых курсаў сцэнарыстаў і рэжысёраў у Маскве. З 1978 года на творчай працы.

Першая кніга прозы Алега Ждана "У час развітання" выйшла ў 1975 г.

Творы пісьменніка друкуюцца ў часопісах "Нёман", "Новый мир", "Знамя", "Дружба народов", "Юность". Выдадзены кнігі прозы: "У гасцях і дома", "Знаёмы", "Рысы і аблічы", "Па абодва бакі прахадной",

“Самастойнае жыцце”; па яго сцэнарыях “Сумленны, разумны, нежанаты” і “Хочаце любіце, хочаце не” – былі зняты фільмы.

Пісьменік займаецца перакладамі на рускую мову твораў беларускіх пісьменнікаў. У сваёй творчасці распрацоўвае дзве тэмы: жыццё рабочага, гараджаніна ў першым пакаленні, які працуе на вялікім заводзе, і побыт людзей правінцыйных гарадоў Беларусі.

У 1993 годзе Беларускі тэатр імя Я.Коласа (Віцебск) паставіў п’есу “Салгалі Богу, салгалі”.

Пісьменнік падтрымлівае цесную сувязь з мясцовай газетай “Святло Кастрычніка”, на старонках якой рэгулярна з’яўляюцца новыя творы пісьменніка.

**Літаратура:**


Белорусцы : повесть в трех сюжетах/ Олег Ждан // Нёман. – 2013. – №6. – С.3–63.

Во время прощания : повесть и рассказы. – Минск, 1975.

В гостях и дома : повесть и рассказы. – Москва, 1977.

Ждан–Пушкин, О. Приключения человека, похоже на еврея : повесть / Олег Ждан–Пушкин // Неман. – 2017. – № 1. – С. 3–45.

Замалёўкі бабінага лета : з ваколіц нашага горада / Алег Ждан // Святло Кастрычніка. – 2014. – № 110. – 10 снежня. – С.4.

Замалёўкі бабінага лета: з ваколіц нашага горада / Алег Ждан // Літаратура і мастацтва. – 2014. – № 50. – 19 снежня. – С.5.

Знакомый : Повести.–Минск, 1977.

Князь. Государыня. Епископ: историческая проза / Олег Ждан. – Минск: Издательский дом «Звязда», 2013. – 624 с.

Мужская любовь : рассказ / Олег Ждан-Пушкин // Нёман. – 2022. – №3. – С. 50– 59

Не погибнет со мной: роман / Олег Ждан // Нёман. – 2014. – №3. – С.3–44; №4. – С. 3–62.

По обе стороны проходной:повести о необычных и обычных людях.– М.,1987.

Пожар в Ослянке : фрагмент романа / Олег Ждан-Пушкин // Святло Кастрычніка. – 2020. – № 80. – 17 кастрычніка. – С. 8.

Праздник продолжается : отрывок из повести / Олег Ждан // Святло Кастрычніка. –2013. – 31 жніўня . – № 67. – С.4.

Прощание: рассказы/ Олег Ждан // Нёман. – 2015. – №10. – С.50–61.

Самостоятельная жизнь:повести о необычных и обычных людях. – Мн.,1990.

Старуха смеется : столичный рассказ / Олег Ждан // Святло Кастрычніка. – 2012. – № 12. – 1 лютага. – С.5.

Трэба цярпець : апавяданні, гумарэскі, пацешкі / Алег Ждан. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2014. – С. 302.

Черты и лица:повести. –Москва,1985.

Ждан Алег : біяграфія // Беларускія пісьменнікі : біябібліяграфічны слоўнік.– Мінск., 1995. – Т. 6. – С. 586–587.

Ждан Алег (Пушкін Алег Аляксеевіч) : знакамітыя людзі // Памяць : Мсціслаўскі раён; Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі. – Мінск, 1999. – С. 527–528.

Альсовы, П. Пошук гістарычнага святла: творчасць А.Ждана / Павел Альсовы // Звязда. – 2014. – № 189. – 4 кастрычніка. – С. 8.

Кравцова, В. Сюжеты нашего города : [1 сентября во время празднования Дня письменности состоялось награждение победителей республиканского конкурса «Национальная литературная премия» за произведения, написанные в 2018 году. Победителем в номинации «Лучшее произведение прозы» стал наш земляк Олег Ждан (Пушкин) с книгой «Гений»] / Валентина Кравцова // Святло Кастрычніка. – 2019. – № 78. – 19 кастрычніка. – С. 8.

Ладудька, К. Живое вырастает из живого : Олег Ждан – белорусский писатель / Кирилл Ладудька // Святло Кастрычніка. – 2016. – № 12. – 17 лютага. – С. 5.

Ладутько, К. Праздник продолжается : творчество Олега Ждана/ Кирилл Ладутько // Народная газета. – 2014. – № 142. – 12 декабря. – С. 16.

Локун, В. Олег Ждан: траектория жизни – траектория таланта / Валентина Локун // Нёман. – 2013. – №11. – С.180–192.

## 95 год з дня нараджэння Зарэмскага Антона Рыгоравіча, Героя Сацыялістычнай працы

**Зарэмскі Антон Рыгоравіч** нарадзіўся 15 чэрвеня 1928 г. у в. Рудодзіма Мсціслаўскага раёна. З 1944 г. калгаснік калгаса “Сцяг працы”, з 1955 г. – трактарыст. Са жніўня 1979 г. у сувязі з рэарганізацыяй калгаса “Сцяг працы” працаваў у калгасе імя Энгельса (па 1988 г.). Званне “Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі БССР” прысвоена ў 1986г.

**Літаратура:**

Зарэмскі Антон Рыгоравіч: Заслужаныя работнікі сельскай гаспадаркі// Памяць: Мсціслаўскі раён: Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі.–Мінск, 1999.–С. 515.

## 130 год з дня нараджэння Ісаковіча Уладзіміра Мікалаевіча, Героя Сацыялістычнай працы



**Ісаковіч Уладзімір Мікалаевіч** нарадзіўся 23 сакавіка 1893 г. у Мсціславе. У 1907 г. скончыў Мсціслаўскае гарадское вучылішча і паехаў з бацькам на

заробкі ў Харкаў. У 1907 – 1914 гг. – рабочы на розных прадпрыемствах Харкава. З 1913 г. – удзельнік рэвалюцыйнага рабочага руху. У 1914 г. быў прызваны ў царскую армію і залічаны ў роту сувязі запаснога батальёна, які нёс службу ў Петрагарадзе. На франтах першай сусветнай вайны вёў прапаганду сярод салдат. Пасля Лютаўскай рэвалюцыі быў абраны членам Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў і членам Прэзідыўма ад салдат Глухаўскага гарнізона. З мая 1917 г. – член агітацыйнай камісіі Харкаўскага Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў, з лістапада – арганізатар і камандзір атрада Чырвонай гвардыі ў Харкаве. З чэрвеня па кастрычнік 1918 г. – упаўнаважаны Ваеннага рэвалюцыйнага камітэта Украіны па арганізацыі паўстанцкага руху на Украіне. З ліпеня 1918 г. па даручэнні ЦК КП(б)

Украіны і Цэнтральнага ваенна-рэвалюцыйнага камітэта прымаў удзел у арганізацыі 1-ай Украінскай савецкай дывізіі як камісар Таращчынскага палка. З сакавіка 1919 па жнівень 1919 г. – паліткамісар дывізіі, якой камандаваў М. Шчорс. У 1920 г. прымаў удзел у баях супраць Урангеля як камісар Херсонскай групы войск.

У 1921–1923 гг. – на партыйнай рабоце. Працаваў сакратарам укама, губкама (г. Нікалаеў), адказным інструктарм ЦК КП(б) Украіны.

У 1923–1926 гг. служыў у Чырвонай Арміі начальнікам палітаддзела і ваенкамам 5-ай Віцебскай дывізіі, начальнікам арганізацыйнага аддзела Палітупраўлення Украінскай Ваеннай акругі.

З 1927 па 1932 г. – зноў на партыйнай рабоце ў Маскве, потым вучоба ў Інстытуце чырвонай прафесуры. З 1933 па 1936 г. быў начальнікам Палітаддзела грамадзянскай авіацыі Украіны. З 1936 па 1941 г працаваў у акадэміі навук УССР. Кандыдат эканамічных навук. Быў дырэктарам па навуковай рабоце Інстытута эканомікі.

У гады Вялікай Айчыннай вайны – на фронце.

З 1945 г. – на партыйнай і выдавецкай рабоце ў АН УССР. Узнагароджаны двума ордэнамі Айчыннай вайны, ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга і пяццю медалямі.

Памёр 10 лістапада 1966 г.

**Літаратура:**

Ісаковіч Уладзімір Мікалаевіч: Удзельнікі Кастрычніцкай рэвалюцыі// Памяць: Мсціслаўскі раён: Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі. – Мінск, 1999. – С. 114–115.

## 100 год з дня нараджэння Калістратава Міхаіла Мацвеевіча, Заслужанага настаўніка БССР

**Калістратаў Міхаіл Мацвеевіч**нарадзіўся 12 жніўня 1923 г. у в. Прудок Чавускага раёна Магілёўскай вобласці ў сялянскай сям'і. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З ліпеня 1941 па май 1945 г. ваяваў на Калінінскім,

1-ым Прыбалтыйскім і 3-ім Беларускім франтах. У 1949 г. скончыў Магілёўскі педагагічны інстытут. Працаваў у Мсціслаўскім раёне з1949 па 1966 г.: дырэктар першай гарадской сярэдняй школы, загадчык раёна, дырэктар школы глухіх дзяцей. Выдатнік народнай асветы(1955). Званне "Заслужаны настаўнік БССР" прысвоена ў1966 г. Жыве і працуе ў Магілёве: дырэктар абласнога Інстытута ўдасканалення настаўнікаў, выкладчык на кафедры гісторыі педагагічнага інстытута, а з 1977 па 1984 г. дырэктар 21-ай сярэдняй школы. З 1984 па 1992 г. працаваў у Мінску ў Гарадскім інстытуце ўдасканалення настаўнікаў. Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны 1 ступені, Чырвонай Зоркі, медалямі "За адвагу", "За перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941-1945 гг.", ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалём "За працоўную доблесць", дзвюма Ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР і Граматай Вярхоўнага Савета БССР.

**Літаратура:**

Калістратаў Міхаіл Мацвеевіч: Заслужаныя настаўнікі// Памяць: Мсціслаўскі раён: Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі. – Мінск, 1999. – С. 511–512.

## 95 год з дня нараджэння Каржуевай Лідзіі Давыдаўны, Заслужанага ўрача БССР



**Каржуева Лідзія Давыдаўна** нарадзілася ў 1928 г. у в. Ярмолаўка Горацкага раёна Магілёўскай вобласці ў сялянскай сям'і. У 1946 г. скончыла Хамініцкую сямігадовую школу, у 1949 г. – Магілёўскую фельчарска – акушэрскую школу, у 1955 г. – Віцебскі медыцынскі інстытут з адзнакай. Працавала ў Мсціслаўскім раёне загадчыцай Шыркаўскай бальніцы. З 1957 г. – галоўны ўрач Капачоўскага сельскага ўрачэбнага ўчастка. Званне «Заслужаны ўрач БССР" прысвоена ў 1970 г.Узнагароджана ордэнам "Знак Пашаны", дзвюма Ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР, значком "Выдатнік санітарнай абароны".

**Літаратура:**

Каржуева Лідзія Давыдаўна: Заслужаныя ўрачы// Памяць: Мсціслаўскі раён: Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі. – Мінск, 1999. – С. 515–516.

## 100 год з дня нараджэння Касцюшкіна Апанаса Парфёнавіча, Героя Сацыялістычнай працы

**Касцюшкін Апанас Парфёнавіч**нарадзіўся ў 1923 г. у в. Сялец Мсціслаўскага павета ў сялянскай сям'і. Скочыў пачатковую школу. У 1939 г. пачаў працоўную дзейнасць у калгасе "Чырвоны Сялец". Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. У лютым 1943 г. быў цяжка паранены. Пасля лячэння ў шпітале прызнаны непрыгодным да ваеннай службы. У 1946 г. вярнуўся ў родную вёску і працаваў у калгасе "Чырвоны Сцяг", а з 1960 г. – брыгадзірам вытворчай брыгады калгаса імя Чапаева.

Узнагароджаны ордэнамі Леніна (1968),"Знак Пашаны" (1964).

Памёр 9 мая 1993 г.

**Літаратура:**

Касцюшкін Апанас Парфёнавіч: Узнагароджаныя ордэнам Леніна// Памяць: Мсціслаўскі раён: Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі. – Мінск, 1999. – С. 504.

## 205 год з дня нараджэння Кіркора Адама – Ганоры Карлавіча, выдаўца, гісторыка літаратуры

**Кіркор Адам – Ганоры Карлавіч**нарадзіўся ў студзені 1818 г. у двары Слівін Мсціслаўскага павета, ў сям'і збяднелага шляхціча, татарына па паходжанню. Ён вучыўся ў Віленскай і Магілёўскай гімназіях, у Віленскім шляхецкім інстытуце, пасля працаваў у Віленскай казённай палаце. Аднак А. Кіркор менш за ўсё цікавіўся службай, а больш выдавецкай і даследчыцкай дзейнасцю.У Вільні ў 1843 г., ён пачаў выдаваць па-польску літаратурна – навуковыя альманахі "Радэгаст" і "Разумовыя дзённікі". Тры тамы апошніх выйшлі ў 1845–46 гг.. Пазней, у 1850–54 гг. плёнам яго дзейнасці сталі "Памятные книжки Виленскай губернии". Пасля забароны гэтага выдання (чыноўнікі знайшлі "шкодныя тэндэнцыі") А. Кіркор у 1857–58 гадах выдаваў "Виленский сборник", а затым у 1859–62 гг. – "Віленскі альманах", дзе змяшчаліся працы па гісторыі і этнаграфіі Беларусі і Літвы.

З 1855 г. ён працуе захавальнікам Віленскага музея старажытнасцей, якому ахвяраваў сваю калекцыю археалагічных знаходак, з'яўляецца сябрам Віленскай археалагічнай камісіі. У наступным годзе навуковец абіраецца сябрам – карэспандэнтам імператарскага археалагічнага таварыства, а яшчэ праз год – сябрам Рускага геаграфічнага таварыства. У свой час у Мінскім, Барысаўскім, Віленскім, Ашмянскім, Вілейскім і Навагрудскім паветах ён раскапаў і даследваў звыш 1 тыс. курганаў.

У 1859 г. Адам Кіркор набывае друкарню Т. Глюксбэрга, дзе выдае танныя кніжкі для тутэйшага люду, а таксама "Виленский вестник". Вакол гэтага неардынарнага чалавека групуюцца мясцовыя інтэлігенты – патрыёты,

сярод якіх варта адзначыць В. Дуніна–Марцінкевіча, У. Сыракомлю, А. Вярыгу–Дарэўскага.

Як гэта дзіўна, хто адраджае культуру, гістарычную спадчыну народа ва ўсе часы не падабаліся ўладам. Не быў выключэннем і А. Кіркор. Яго вымусілі пакінуць Вільню і з’ехаць у Пецярбург. Там ён стаў адным з выдаўцоў газеты “Новое время” (1868–71 гг.). З 1872 г. навуковец выкладае ў Кракаўскім тэхнічна–прамысловым музеі курс славянскай літаратуры. У наступным годзе яго абіраюць сябрам Кракаўскай акадэміі.

Восем ягоных грунтоўных нарысаў, прысвечаных роднай Беларусі, якія ўвайшлі ў знакаміты трэці том “Живописной России” (часткі 1 і 2, 1882 г.), у гэтай працы аўтар спыніўся на вузлавых пытаннях старажытнай гісторыі Беларусі, а таксама даў досыць шырокае і ўсебаковае ўяўленне пра Беларусь і яго народ. А. Кіркор шмат расказвае пра гарады і мястэчкі Магілёўскай губерніі: Шклоў, Бялынічы, Горкі, Дрыбін і інш. Знаёміць з гісторыяй губерніі, этнаграфіяй, культурай, архітэктурай і археалогіяй.

Памёр А. Кіркор 23 лістапада 1886 г.

**Літаратура:**

**Асноўныя працы:**

Живописная Россия: Отечество наше в его зем., ист., плем., экон., и быт.значении: Литовское и Белорусское Полесье: Репринт, воспроизведение издания 1882 г.–Минск, 1993.–550 с.

Очерки 1 – 8 написаны А. Киркором.

Киркор, А. Перечневый каталог предметов в Виленском музее древностей/ А. Киркор.–Вильна, 1858.–22 с.

Киркор, А. Этнографический взгляд на Виленскую губернию/ А. Киркор// Этнографический сборник, издаваемый Р.Г.О.–Вып. 3.–Спб., тип. Э. Праца, 1858.–С. 115–276.

**Аб жыцці і дзейнасці:**

Кіркор А.// БелСэ.–1972.–Т. 5.–С. 590.

Кіркор А. Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5 т.– Мінск,1986.–Т. 3.–С. 52.

Кіркор А.К. Даследчыкі роднага краю: Краязнаўцы і гісторыкі – ураджэнцы Магілёўшчыны:біябібліяграфічны паказальнік;[складальнікі: Гурковіч Л.Я. Украінка З.М.].–Магілёў, 1995.–С. 23–26.

Адам Кіркор, Лойка, А. Гісторыя беларускай літаратуры:дакастрычніцкі перыяд. Ч. 1/ А. Лойка.–Мінск, 1977.–С. 113–115.

Аляксееў, Л. Выдатны археолаг і краязнавец/ Л. Аляксееў// Полымя.– 1979.– № 59.–С. 204–209.

Глінік, А. Адам Кіркор (1819–1886)/ А. Глінік // Роднае слова.–1993.– №1.–С. 79.

Запрудскі, І. І. Энцыклапедыя беларусазнаўства:нарысы А. Кіркора пра Беларусь у 3 т. “Живописной России” за 1882 г./ І. І. Запрудскі// Беларуская літаратура: міжведамственны зборнік.–Мінск., 1992.–Выпуск 20. –С. 112–130.

Киркор Адам// История белорусской дооктябрьской литературы.– Минск, 1977.–С. 338.

Кіркор А.К. (1818–1886)// Каханоўскі, Г.А. Археалогія і гістарычнае краязнаўства Беларусі ў 16–19 ст./ Г.А. Каханоўскі.–Мінск, 1984.–С. 56–61.

Климановский, С. Новое о Киркоре/ С. Климановский// Нёман.–1969.– №7.–С. 188–191.

Літвінава, Т. Ля вытокаў беларускага краязнаўства// Гомельская праўда.–1986.–22 лістапада.

Першы беларускі краязнавец // Беларусь.–1946.–№4.–С. 61.

Юрчанка, Г. З кагорты пачынальнікаў/ Г. Юрчанка// Святло Кастрычніка (Мсціслаў).–1995.–16 жніўня.

Янушкевіч, Я. У прадчуванні знаходак/ Я. Янушкевіч// Полымя.–1992.– №4.–С. 173–206.

Янчук, Н., А. Киркор:краткий очерк жизни и деятельности/ Н. Янчук.– Москва: типография А.И. Мамонтова и К, 1888.–29 с.

Янчук, Н.А., А.К. Киркор – учёный исследователь Литвы и Белоруссии/ Н.А. Янчук.–Киев: типография А. Давыденко, 1887.–17 с.

Яцкевіч, З. Адам Кіркор/ З. Яцкевіч// Вестник Могилёва.–1993.–26 марта.

## 95 год з дня нараджэння Кірпічэнкі Ніны Кузьмінічны, Героя Сацыялістычнай працы



**Кірпічэнка Ніна Кузьмінічна**нарадзілася ў 1928 г. у в. Калатовіна Мсціслаўскага раёна ў сялянскай сям’і. Працоўную дзейнасць пачала ў 1945 г. у г. Крычаве Магілёўскай вобласці касірам. З 1946 г. калгасніца калгаса “Чырвонаармеец” Мсціслаўскага раёна. У 1955 г. была абрана старшынёй выканкама Чырвонагорскага Савета працоўных дэпутатаў. Працавала больш 35 гадоў.

У 1971 г. за поспехі ў развіцці сельскагаспадарчай вытворчасці і выкананне пяцігадовага плана па продажу прадуктаў земляробства і жывёлагадоўлі ўзнагароджана ордэнам Леніна.

**Літаратура:**

Кірпічэнка Ніна Кузьмінічна: Узнагароджаны ордэнам Леніна// Памяць: Мсціслаўскі раён: Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі. – Мінск, 1999. – С. 504.

## 160 год з дня нараджэння краязнаўца, Краснянскага Уладзіміра Гаўрылавіча



**Краснянскі Уладзімір Гаўрылавіч**нарадзіўся 9. (21) ліпеня 1863 г. у в. Руціна Валдайскага павета Наўгародскай губерніі. Пасля заканчэння Пецярбургскага гісторыка – філалагічнага інстытута ў 1886 г. быў накіраваны ў Беластоцкае рэальнае вучылішча. Праз чатыры гады Уладзімір Гаўрылавіч пачаў сваю краязнаўчую дзейнасць. Ён удзельнічаў у курганных раскопках ля сяла Эсьмоны на Магілёўшчыне. Аднак археалогія не захапляла Краснянскага. Ён заняўся гістарычнымі даследваннямі перыяду Айчыннай вайны 1812 г. Гэтаму спрыяў пераезд у Мінск, дзе на працягу сямі гадоў выкладаў гісторыю і геаграфію ў мясцовай гімназіі.

У 1902 г. у “Журнале минестерва народного просвещения” была апублікована першая даследчая работа Уладзіміра Гаўрылавіча “Мінскі дэпартамент Вялікага княства Літоўскага (эпізод вайны 1812 г.)”. Апісаўшы ўступленне французаў у Мінск і стварэнне імі новых органаў улады, У.Г. Краснянскі падрабязна расказаў пра барацьбу народных мас супраць захопнікаў.

У гэтыя ж гады краязнавец падрыхтаваў і апублікаваў яшчэ дзве работы – “Мінская гімназія ў 1861–65 гадах (старонка з гісторыі польскага паўстання 1853 г.)” і “Горад Барысаў і Барысаўскі павет у Айчыннай вайне 1812 г.” У апошняй аўтар працягваў распрацоўваць тэму, якой аддаў шмат гадоў.

У 1906 г. У.Г. Краснянскі пераехаў у Мсціслаў, дзе працаваў дырэктарам мясцовай гімназіі. У Мсціслаўле ён падрыхтаваў і выдаў кнігу “Горад Мсціслаў Магілёўскай губерні”, якая не страціла свайго навуковага значэння да гэтага часу. Аўтар даў агульнае апісанне горада, закрануў пытанні развіцця яго прамысловасці і гарodскай гаспадаркі. Вельмі каштоўны і гістарычны нарыс Мсціслава, якім заканчваецца даследванне.

У чэрвені 1911 г. У.Г. Краснянскі па службе пераязджае ў Віцебск, дзе працуе дырэктарам рэальнага вучылішча. З таго часу ўся навуковая дзейнасць звязана з гэтым горадам.

Памёр У.Г. Краснянскі ў Віцебску 4 мая 1930 г.

**Літаратура:**

**Асноўныя працы:**


Краснянский, В.Г. Борисов и Борисовский уезд в Отечественную войну 1812 г./ В.Г. Краснянский.–Гродна: Губ. тип., 1913.–53 с.: 1 вкл. л. карт.

Краснянский, В.Г. Город Мстиславль Могилёвской губернии с 50 автотипиями/ В.Г. Краснянский.–Вильна, 1912.–99 с.: рис.

Краснянский, В.Г. Минский департамент Великого княжества Литовского/ В.Г. Краснянский.–Спб: Сенат. тип., 1902.–72 с.


**Аб жыцці і дзейнасці:**


Краснянскі У.Г.Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5 т.– 1987.–Т. 3.–С. 122.

Краснянскі У. Г. Даследчыкі роднага краю: краязнаўцы і гісторыкі – ураджэнцы Магілёўшчыны/Біябібліяграфічны паказальнік: [складальнікі: Гурковіч Л.Я., Украінка З.М.]–Магілёў, 1995.– С. 26–27.

Краснянскі Уладзімір Гаўрылавіч// Памяць: Мсціслаўскі раён: Гісторыка-дакументальные хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі.–Мінск., 1999.– С. 79–80.

Падліпскі, А. Краязнавец і даследчык/ А. Падліпскі// Помнікі гісторыі і культуры Беларусі.–1985.–№1.– С. 28–29.

Падліпскі, А. Летапісец Мсціслава/ А. Падліпскі// Святло Кастрычніка (Мсціслаў).–1982.–31 ліп.


## 110год з дня нараджэння Манышава Міхаіла Мікалаевіча, Заслужанага настаўніка БССР

**Манышаў Міхаіл Мікалаевіч**нарадзіўся 22 сакавіка 1913 г. у в. Галачоўка Чавускага павета Магілёўскай губерні. У 1937 г. скончыў Магілёўскі педагагічны інстытут. Педагагічную дзейнасць пачаў у 1938 г. настаўнікам геаграфіі Галіцкай сямігадовай школы Клімавіцкага раёна. З 1938 г. працаваў завучам Благавіцкай сярэдняй школы ў Чавускім раёне, з 1940 г. – інспектарам раёна. Пасля дэмабілізацыі з радоў Савецкай Арміі з

1945 г. працаваў у Мсціславе: завучам педагагічнага вучылішча, з 1948 г. па 1976 г. – завучам Мсціслаўскай школы глухіх дзяцей. Узнагароджаны значком “Выдатнік народнай асветы БССР” (1960), медалём Н.К. Крупскай (1969). Званне “Заслужаны настаўнік БССР” прысвоена ў 1964 г. М. Манышаў аўтар і сааўтар пяці падручнікаў для школ глухіх.

Памёр 24 снежня 1997 г.

**Літаратура:**

Манышаў Міхаіл Мікалаевіч: Заслужаныя настаўнікі// Памяць: Мсціслаўскі раён: Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі.–Мінск, 1999.–С. 513.

## 110 год з дня нараджэння Міронава Рыгора Ільіча, Героя Сацыялістычнай працы

**Міронаў Рыгор Ільіч**нарадзіўся ў 1913 г. у в. Мішні Мсціслаўскага павета. Пачаў працаваць у 1922 г. Быў пастухом, батраком, чорнарабочым на чыгунцы. Скончыў сямігодку. З 1932 г. у Савецкай Арміі. Служыў у Беларускай ваеннай акрузе: курсант курсаў малодшых камандзіраў, палітрук. У перыяд Вялікай Айчыннай вайны – на Далёкаусходнім фронце: палітрук, камісар батальёна. Пасля дэмабілізацыі з 1946 г. – у Мсціслаўскім раёне на партыйнай і савецкай рабоце. З 1956 г. – старшыня калгаса “Чырвоны Арты”, затым на гаспадарчай рабоце, а з 1961 г. – старшыня калгаса “1 Мая”. Выбіраўся членам Мсціслаўскага райкама КПБ, дэпутатам раёнага Савета народных дэпутатаў.

Узнагароджаны двума ордэнамі Леніна (1966, 1971), ордэнамі Чырвонай Зоркі (1945), медалямі.

Памёр у 1996 г.

**Літаратура:**

Міронаў Рыгор Ільіч: Узнагароджаны ордэнам Леніна// Памяць: Мціслаўскі раён: Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі. – Мінск, 1999. – С. 506.

## 60 год з дня нараджэння Мураўёва Мікалая Станіслававіча, загінуўшыга ў Афганістане



**Мураўёў Мікалай Станіслававіч** нарадзіўся 13 чэрвеня 1963 г. у в. Пятрыгі Мсціслаўскага раёна. Бацькі, Яўгенія Іванаўна і Станіслаў Паўлавіч, рабочыя саўгаса “Забалацце” Мсціслаўскага раёна. У 1979 г. скончыў 8 класаў Доўгавіцкай сярэдняй школы, у 1983 г. – СПТВ № 49 г. Мсціслава па спецыяльнасці трактарыст – машыніст.

Працаваў трактарыстам у саўгасе “Забалацце”. У верасні 1983 г. прызваны ў Савецкую Армію Мсціслаўскім РВК. Служыў у Афганістане. У баі 21 красавіка 1984 г. быў цяжка паранены. Адпраўлены ў ваенны шпіталь г. Львова (Украіна). Памёр ад ран у шпіталі. Пахаваны на радзіме ў в. Пятрыгі. Пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі**.** Піянерскай арганізацыі Забалацкай сярэдняй школы прысвоена імя М. С. Мураўёва.

**Літаратура:**

Мураўёў Мікалай Станіслававіч: Загінуў у Афганістане// Памяць: Мсціслаўскі раён: Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі. – Мінск, 1999. – С. 545.

## 255 гадоў з дня нараджэння Насовіча Івана Іванавіча, мавознаўца-лексікографа, фальклярыста, этнографа

Знакамітымовазнавец-лексікограф, фальклярыст, этнограф, якога па праву лічуць беларускім Далем, доўгі час супрацоўнічаў з Імператарскім Рускім Геаграфічным таварыствам па Аддзяленню этнаграфіі, быў яго член-супрацоўнікам. І.І.Насовіч – лаўрэат Дзямідаўскай і Увараўскай прэмій Акадэміі навук, уладальнік Малога залатога медаля Геаграфічнага таварыства.



**Насовіч Іван Іванавіч**нарадзіўся 7 кастрычніка 1768 года ў сям’і праваслаўнага дзяка ў с. Гразівец Быхаўскага павета (зараз вёска Чавускага раёна). Іван Іванавіч з 1798 па 1812 год вучыўся ў Магілёве, спачатку ў гімназіі, потым у Духоўнай семінарыі (будынак семінарыі ў той час знаходзіўся ля архіерэйскага палаца на пачатку сучаснай вуліцы Ленінскай, не захаваўся).

Пасля паспяховага заканчэння семінарыі Іван Іванавіч пачынае сваю педагагічную дзейнасць у якасці настаўніка, затым інспектара Аршанскага духоўнага вучылішча.

Праз год Іван Насовіч, па прапанове мсціслаўскага рэктара змяняе сваё месца жыхарства. У Мсціславе вучылішчны інспектар Насовіч, дзякуючы сваім дараванням кіраўніка, арганізатара і музыканта (скрыпача), стварае вучнёўскі хор. З 1818 па 1822 гг. І.І. Насовіч знаходзіўся на пасадзе рэктара Мсціслаўскага духоўнага вучылішча.

З 1822 года на працягу 21 года Насовіч працаваў у сістэме Міністэрства Народнай асветы – загадчыкам, наглядчыкам, выкладчыкам Дынабурскай (зараз г. Даўгаўпілс) гімназіі, Маладзечанскага і Свенцянскага дваранскіх вучылішчаў. За плённую педагагічную працу Іван Іванавіч атрымаў з рук Мікалая І ордэн Св. Станіслава 3 ступені. У 1843 годзе ён раптоўна выйшаў у адстаўку, пераяджае ў Мсціслаў, дзе для сям’і набывае дом.

У 1847 годзе І.І. Насовіч атрымаў з Геаграфічнага таварыства Праграму па збору этнаграфічных матэрыялаў, згодна якой ён пачаў збіраць матэрыялы па беларускай мове. З гэтай мэтай Насовіч аб’ехаў Мінскую, Гродзенскую і Магілёўскую губерніі. Праз тры гады ён паслаў у акадэмію рукапісныя “Кароткія філалагічныя назіранні над беларускай гаворкай”, “Невялікі беларускі слоўнік”, “Зборнік беларускіх прыказак”. Насовіч надрукаваў зборнік “Беларускія прымаўкі і прыказкі”, склаў “Алфавітны паказальнік старажытных беларускіх слоў, выбраных з Актаў, што адносяцца да гісторыі Заходняй Расіі” (Увараўская прэмія ў памеры 1.500 рублёў, 1865 г.).

У 1864-70 гадах І.І. Насовіч жыў у сталіцы, дзе працаваў у архіве Публічнай бібліятэкі, супрацоўнічаў з Рускім Геаграфічным таварыствам (у 1865 годзе быў абраны член-супрацоўнікам таварыства па Адзяленню этнаграфіі).

За надрукаваны ў 1867 годзе “Зборнік беларускіх прыказак” (3,5 тыс. прыказак, прымавак, праклёнаў і да т.п.) Іван Іванавіч Насовіч быў узнагароджаны Малым залатым медалем Геаграфічнага таварыства. У наступным годзе ён друкуе “Беларускія прыказкі і прымаўкі”, а ў 1870 годзе – вяршыню навуковай працы “Слоўнік беларускай мовы” з больш чым за 30 тысяч словамі і іх тлумачэннямі, у 1881 – дадатак да слоўніка.

За працы ў галіне этнаграфіі і мовазнаўства Насовіч у 1870 годзе быў узнагароджаны ордэнам Св. Станіслава 2 ступені.

Будычы з 1876 года цяжка хворым, І.І. Насовіч працягваў працу – дыктаваў па памяці сабраныя матэрыялы, а яго сын іх запісваў. У 1877 годзе Насовіч зусім аслеп, аслабеў. Памёр беларускі Даль 6 жніўня 1877 года. Яго цела пахавана на могілках Тупічэўскага манастыра.

У гонар славутага навукоўца, члена Геаграфічнага таварыства ў Мсціславе названа вуліца.

**Літаратура:**

**Асноўныя навуковыя працы:**

Белорусские песни, собранные И.И. Носовичем.–Сибирская типография Майкова, 1874.–236 с.

Белорусские пословицы и загадки:дополнениек сборнику белорусских пословиц, помещенных в Т.1. «Зап. РГО по Отделению этнографии». – Сибирская типография Майкова, 1868.–19 с.

Белорусские пословицы и поговорки. Сборник.–Сибирская типография Академии наук, 1852.–79 с.

Дополнение к белорусскому словарю И.И. Носовича:слова, извлеченные из составленного им рукописного собрания белорусских песен и сказок.–Сибирская типография Академии наук, 1881.–22 с.

Сборник белорусских пословиц.–Сиб., ОРЯС Академия наук, 1874.–232 с.

Словарь белорусского наречия.–Спб., ОРЯС Акад. наук, 1870.–756 с.

Слоўнік беларускай мовы / Аўтар уступнага артыкула М.Р. Суднік.–Мінск: БелСЭ, 1983.–756 с.

**Аб жыцці і навуковай дзейнасці:**

Насовіч Іван Іванавіч – беларускі мовазнавец, фалькларыст і этнограф // Беларуская ССР: кароткая энцыклапедыя : [у 5 т.]. –Мінск, 1981.–Т. 5. – С. 445.

Насовіч І.І. Беларускія пісьменнікі: бібліяграфічны слоўнік: [у 6 т.].–Мінск, 1994.–Т. 4. – С. 381–382.

Насовіч І.І. Географы і геолагі – ураджэнцы Магілёўскай вобласці: бібліяграфічны паказальнік.–Магілёў, 1995.–С. 26–28.

Насовіч Іван Іванавіч // Бел. СЭ, 1973.–С. 437.

Насовіч Іван Іванавіч // Энцыклапедыялітаратуры і мастацтва Беларусі.–Мінск, 1985.–С. 332–333.

Насовіч Іван Іванавіч: звязаў іх лёс з Мсціслаўшчынай// Памяць: Мсціслаўскі раён: Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі.–Мінск, 1999.–С. 80–81.

Насовіч Іван Іванавіч. Пісьменнікі Магілёўшчыны: бібліяграфічны паказальнік: [складальнікі :Новікава Н.А., Катлёнак А.А.].–Магілёў, 1993.–С. 168–169.

Абабурка М. Багатая душа народа…:да 100-годдзя з дня смерці І.І. Насовіча//Магілёўская праўда.–1977.–23 ліпеня.

Абабурка М. Беларускі Даль // Магілёўская праўда.–1988.–30 верасня.

Антропаў М.П., Ліцвінка В.А. Славуты фалькларыст і лексікограф : да 200-годзя з дня нараджэння І.І. Насовіча // Веснік БДУ. Серыя 4.–1988.–№ 3.–С. 6–9.

Бандарчык В.К. З клопатам аб роднай мове: 200 гадоў з дня нараджэння І.І. Насовіча. Ураджэнец В. Гразівец Быхаўскага раёна] // Беларуская мова і літаратураў школе.–1988.–№ 10.– С.72–73.

Бандарчык В.К. Насовіч І.І. Этнаграфія Беларусі:энцыклапедыя.–Мінск., 1989.–С. 363–364.

Бандарчык В., Сабаленка Э. Этнограф, фалькларыст, мовазнаўца // ЛіМ.–1963.–30 жніўня.

Бегуновіч А. Гонар зямлі Мсціслаўскай// Святло Кастрычніка (Мсціслаў).–1988.–4 кастрычніка.

Жураўскі А., Крамко І. Навуковы подзвіг // ЛіМ.–1962.–12 кастрычніка.

Камароўскі Я. І.І. Насовіч і яго слоўнік // Беларусь.–1957.–№ 7.–С. 28.

І.І. Насовіч. Асвета і педагагічная думка ў Беларусі.–Мінск, 1985.–С. 332–333.

Насовіч І.І. Бандарчык В. Гісторыя беларускай этнаграфіі XIX ст.–Мінск, 1964.–С. 109–111.

Насовіч І.І. Географы і геолагі – ураджэнцы Магілёўскай вобласці: Бібліяграфічны паказальнік.–Магілёў,1995.–С. 26–29.

Камароўскі Я., Прыгодзіч М. З верай у шчаслівую долю // Чырвоная змена.–1989.–19 снежня.–С. 4–5.

Мініна В. Збіральнік жывога слова // Іскра (Чавусы).–1994.–29 чэрвеня.

Міхайлаў П.І. Навуковы подзвіг:да 200-годдзя з дня нараджэння І.І. Насовіча // Беларуская лінгвістыка.–1988.–Выпуск 34.–С. 59–64.

Сіцько З. Вяшчун прадвесня // Наша слова.–1993.–6 кастрычніка.–С. 5.

Скварцоў І. Слова роднае, беларускае: Беларускіфалькларыст і этнограф І.І.Насовіч– наш земляк, ураджэнец г. Прапойска// Магілёўская праўда.–1984.–11 мая.

Срезневский И.И. Разбор словаря белорусского наречия г. Носовича.–СПб: тип. Акад. Наук, 1981.–22 с.

Срезневский И.И. Разбор сочинения И. Носовича:алфавитный указатель старинных слов, извлечённых из «Актов, относящихся к истории Западной России», изданных в 1853 году.–СПб.: типография Академии Наук, 1986.–3 с.

Суднік М. І.І. Насовіч:агляд навуковай дзейнасці //Беларусь.–1946.–№ 7.–С. 24–27.

Суднік М.Р. Іван Іванавіч Насовіч – выдатны вучоны і асветнік// Весці АН БССР : Серыя грамадскіх навук.–1989.–№ 2.–С. 92–98.

Цішчанка І. Першапраходзец // Святло Кастрычніка (Мсціслаў).–1984.–1 студзеня.

Цішчанка І. Першапраходзец // Полымя.–1983.–№ 10.–С. 149–163.

Шейн П.В. Иван Иванович Носович :краткий биографический очерк.–СПб., типография Академии наук, 1900.–13 с.

Яскевіч А. Невядомае пра Івана Насовіча // Голас Радзімы.–1989.–16 сакавіка.–С. 7.

Яцкевіч З. Іван Насовіч :этнограф // Вестник Могилёва.–1993.–15 апреля.–С. 6.

## 90 год з дня нараджэння Новікавай Ганны Аляксандраўны, вучонагадаследчыка у галіне біялогіі асноўных дрэвавых парод беларускіх лясоў, кандыдата біялагічных навук

**Новікава Ганна Аляксандраўна**нарадзілася 25 мая 1933г. у Мсціславе ў сям'і служачых. Вучоны даследчык у галіне біялогіі асноўных дрэвавых парод беларускіх лясоў.Кандыдат біялагічных навук. Пэўны час жыла ў Кіеве, там у 1950 г. скончыла сярэднюю школу і паступіла на лесагаспадарчы факультэт Украінскай сельскагаспадарчай акадэміі. Пасля

заканчэння працавала ў Кіеўскім трэсце "Леспраект" таксатарам. З 1957 г. у Мінску ў аспірантуры Інстытута біялогіі АН БССР па спецыяльнасці дэндралогія. У 1963 г. абараніла дысертацыю "Сезонны рытм росту і развіцця драўнінных раслін" на вучоную ступень кандыдата біялагічных навук. Была прызначана старшым навуковым супрацоўнікам. Аўтар больш 50 навуковых прац. У 1976 г. выйшла манаграфія "Рост і развіццё пупышак у некаторых драўнінных раслін".

**Літаратура:**

Новікава Ганна Аляксандраўна: Знакамітыя людзі// Памяць: Мсціслаўскі раён: Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі. – Мінск, 1999. – С. 536–537.

### 85 год з дня нараджэння Падзерні Восіпа Венядзіктавіча, Заслужанага ўчастковага інспектара міліцыі

**Падзерня Восіп Венядзіктавіч** нарадзіўся 17 лютага 1938 г.у в. Казіно Мсціслаўскага раёна ў сям'і калгаснікаў. У 1958 г.скончыў Пячонкаўскую сярэднюю школу, у 1963 г. – Арцёмаўскае вучылішча геолагаў (Украіна), у 1968 г. – Мінскую спецшколу міліцыі імя М. В. Фрунзе. Маёр з 1990 г. З 1958 г. служыў у Савецкай Арміі, з 1968 г. – працаваў у партыі геолагаў у Данбасе, затым у Мсціслаўскім раёне. У райаддзеле ўнутраных спраў (РАУС) з 21 лютага 1964 па 2 чэрвеня 1993 г.: участковы інспектар (1965-1981), з 1990г. старшы інспектар. Званне "Заслужаны ўчастковы іспектар" прысвоена ў 1990г.Узнагароджаны медалямі: "Ветэран працы", "50 год Савецкай міліцыі"; знакамі: "Выдатнік міліцыі", "За выдатную службу па ахове гарамадскага парадку", трыма медалямі "За бездакорную службу ў міліцыю".

**Літаратура:**

Падзерня Восіп Венядзіктавіч: Заслужаны ўчастковы інспектар міліцыі// Памяць: Мсціслаўскі раён: Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі.–Мінск, 1999.–С. 516.

### 95 год з дня нараджэння Пакроўскага Уладзіміра Пятровіча, Героя Сацыялістычнай працы



Нарадзіўся 19.08.1928 г. у г. Мсціслаў. Член КПСС з 1972 г. У 1944-1948 гг. і з 1951 г. манцёр, з 1955 г. кабельшчык-спайшчык эксплуатацыйна-тэхнічнага вузла сувязі ў г. Оршы. Званне Героя Сацыялістычнай Працы

прысвоена ў 1974 г.за поспехі ў выканані планаў і сацыялістычных абавязацельстваў.

**Літаратура:**

Пакроўскі Уладзімір Пятровіч // Беларуская ССР: кароткая энцыклапедыя.–1981.–Т. 5.–С. 459.

Королёв, Г. “Связь работает нормально”/ Г. Королёв // Знаменосцы трудовой славы.–Минск, 1984.–С. 260–263.

## 95 год з дня нараджэння Пруднікава Аркадзя Фёдаравіча, Героя Сацыялістычнай працы



**Пруднікаў Аркадзь Фёдаравіч**нарадзіўся ў 1928 г. у в. Сапрынавічы Мсціслаўскага раёна ў сям’і калгасніка. Перад вайной скончыў 4 класы Сапрынавіцкай пачатковай школы. З 1945 г. пачаў працаваць у калгасе “6 з’езд Саветаў”. Са жніўня 1949 г. служыў у Савецкай Арміі камандзірам аддзялення, старшынёй стралковай роты. У кастрычніку 1952 г. вярнуўся ў родны калгас. У 1958 г. скончыў Мсціслаўскае вучылішча механізацыі сельскай гаспадаркі. Атрымаў спецыяльнасць камбайнёра. Пасля сканчэння курсаў шафёраў у 1963 г. працаваў шафёрам гэтага калгаса. Узнагароджаны ордэнам Леніна (1973).

Памёр 12 чэрвеня 1986 г.

**Літаратура:**

Пруднікаў Аркадзь Фёдаравіч: Узнагароджаны ордэнам Леніна// Памяць: Мсціслаўскі раён: Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі. – Мінск, 1999. – С. 507.

## 130 год з дня нараджэння Рудкіна Піліпа Мікітавіча, Героя Савецкага Саюза



**Рудкін Піліп Мікітавіч**нарадзіўся 27.11.1893 г. у вёскі Чорная Сасна Мсціслаўскага раёна. Генерал-маёр танкавых войск з 1943 г. Член КПСС з 1943 г. Скончыў Ваенную акадэмію механізацыі і матэрызацыі РСЧА ў 1937 г. Уарміі з 1915 г. Учырвонай гвардыі з 1917 г., з1918 г. у органах ВЧК, НКУС. У Айчынную вайну на Карэльскім, Паўднёва-Заходнім, 1-м і 3-м Беларускім

франтах: камандзір танкавай брыгады, корпуса, намеснік камадуючага браня-танкавых і механізіраваных войскамі фронту. Удзельнік Сталінградскай, Курскай бітваў, баёў у Польшчы, Усходняй Прусіі. Вызначыўся ў баях пад Кантэміраўкай, Валуйкамі, Харкавам. Да 1952 г. у Савецкай Арміі.

Указам Прэзідыўма Вярхоўнага Савета Саюза ССР ад 31 сакавіка 1943 года палкоўніку Рудкіну Піліпу Мікітавічу прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Памёр 12.10.1954(57) г.

**Літаратура:**

Рудкін Піліп Мікітавіч //Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне, 1941–1945 : энцыклапедыя / Беларуская Савецкая Энцыклапедыя. – Мінск, 1990. – С. 541.

Рудкин Ф. Н. // Герои Советского Союза: краткий биографический словарь : в 2-х т.–М., – 1987.Т. 1. –С. 379.

Рудкин Филипп Никитович. Навечно в сердце народном:справочник.– 3-е издание.–Минск,1984.–С. 445.

Рудкин Филипп Никитович // Герои Советского Союза могилевчане.– Минск, 1965.–С. 129–130.

Ад радавога да генерала // Святло Кастрычніка (Мсціслаў).–1970.–21 лютага.

Рудкин Филипп Никитович // Нёман.–1967.–№11.–С.13.

Салаўёў М. Танкі ішлі на прарыў // Святло Кастрычніка (Мсціслаў).– 1973.–7 чэрвеня.

Скрозьварожае кальцо // Магілёўская праўда.–1971.–30 студзеня.

Танкі ішлі на прарыў // Святло Кастрычніка (Мсціслаў).–1978.–9 мая.

Фралоў П. Ён ваяваў у Прыбалтыцы // Святло Кастрычніка (Мсціслаў).–1984.–11 жніўня.

Фралоў П. Скрозь варожае кальцо // Святло Кастрычніка (Мсціслаў).– 1983.–7 мая.

## 220 год з дня нараджэння Сердзюкова Івана Іванавіча, публіцыста і вучонага-гаспадарніка

Вядомы публіцыст і вучоны-гаспадарнік сярэдзіны 19 ст.,гаспадар маёнтка Кудрычы на Мсціслаўшчыне.

**Сердзюкоў Іван Іванавіч**нарадзіўся 12.11.1803 г. на Палтаўшчыне. Вучыўся ў Канатопскім вучылішчы, у Чарнігаўскай гімназіі і два гады ў Харкаўскім універсітэце. 17-гадовым хлапчуком пачаў сваю працоўную дзейнасць. Даслужыўся да пасады сталаначальніка ў канцылярыі ваенага губернатара. Адначасова вёў судовыя справы мясцовых памешчыкаў. У 1832 г. удзельнічаў у фарміраванні казацкіх палкоў, за што быў узнагароджаны

брыльянтавым пярстёнкам. У 1842 г. пераязджае ў вёску Кудрычы, у маёнтак, які дастаўся яго жонцы, дзе пражыў 44 гады і там быў пахаваны.

І. І. Сердзюкоў – вечны шукальнік праўды. Ён яшчэ напярэдадні прыгоннай рэформы павёў гаспадарку па шляху, у якім былі вельмі прыкметныя капіталістычныя рысы.

Будаваліся гаспадарчыя пабудовы, прымяняліся культурныя лугі, капаліся асушыльныя і палівальныя канавы, ліквідаваліся аборкі, развівалася жывёлагадоўля, новае ўкаранялася ў паляводства (штучнае ўгнаенні) і інш.

На працягу 1844–1850 гг. І. Сердзюкоў актыўна супрацоўнічаў у "Земледельческой газете". Вёў шырокую перапіску па многіх пытаннях з такімі ж гаспадаркамі, як ён, з розных куткоў Расіі. У 1850 г. ён прызначаецца членам карэспандэнтам "Вольного экономического общества". Пяру І. І. Сердзюкова належаць шматлікія працы: "О ценах на сельские произведения", "О болезни овец", "О белорусском хозяйстве", "О скотводстве", "Испорченное и исправленное хозяйство", "Народные приметы и метеорология", "Очерки хозяйства моего", "Климатология Мстиславского уезда", адзначанныя ганаровым водгукам вучонага камітэта Мінестэрства дзяржаўных маёмасцей.

**Літаратура:**

Гасянкоў, У.Л. Сердзюкоў Іван Іванавіч/ У.Л. Гасянкоў // Памяць: Мсціслаўскі раён: Гістарычна-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі. – Мінск, 1999. – С. 8.

## 90 год з дня нараджэння Скугарэўскага Аляксея Фёдаравіча, прафесара, доктара медыцынскіх навук



**Скугарэўскі Аляксей Фёдаравіч**нарадзіўся 30 сакавіка 1933 г. у в. Шамава ў сям'і калгаснікаў. Доктар медыцынскіх навук, прафесар.

У 1951 г. скончыў Шамаўскую сярэднюю школу і паступіў у Мінскі медыцынскі інстытут, які скончыў у 1957 г. На працягу двух гадоў працаваў урачом – псіхіятарам і загадчыкам аддзялення Віцебскай абласной псіхіятрычнай бальніцы. У 1959–1962 гг. вучыўся ў аспірантуры Мінскага медыцынскага інстытута, з 1962 г. кандыдат медыцынскіх навук. У 1962–1964 гг. працаваў асістэнтам кафедры псіхіятрыі Гродзенскага медыцынскага інстытута, пасля чаго галоўны ўрач псіхіятрычнай бальніцы спецыяльнага тыпу МУС БССР. З лістапада 1966 г. – намеснік галоўнага ўрача па медыцынскай частцы Рэспубліканскай клінічнай бальніцы г. Мінска, з 1973 г. – на кафедры псіхіятрыі Рэспубліканскага інстытута ўдасканалення ўрачоў. З 1989 г. – доктар медыцынскіх навук, з 1991 г. – прафесар кафедры псіхіятрыі Беларускага інстытута ўдасканалення ўрачоў, а з 1993 г. – загадчык гэтай кафедры.

Серыя навуковых прац прысвечана пошукам адэкватных метадаў лячэння пры зацяжным цячэнні псіхозаў. Шмат ўвагі ўдзяляў комплексным даследванням уплыву вынікаў Чарнобыльскай катастрофы на стан здароўя чалавека.

Напісаў і надрукаваў больш за 100 навуковых прац, з іх тры манаграфіі.

Памёр 9 лістапада 1993 г.

**Літаратура:**

Скугарэўскі Аляксей Фёдаравіч: Знакамітыя людзі// Памяць: Мсціслаўскі раён: Гістарычна-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі. – Мінск, 1999. – С. 540.

## 130 год з дня нараджэння Трубчынскага Якава Нікіфаравіча, Героя Сацыялістычнай працы



**Трубчынскі Якаў Нікіфаравіч**нарадзіўся ў 1893 г. у в. Белкі Мсціслаўскага павета ў сям'і бедняка. Чатырнаццігадовым падлеткам пачаў працоўную дзейнасць у Маскве. Зблізіўшыся за час працы з рэвалюцыйна настроенымі рабочымі, прымаў удзел у палітычных дэманстрацыях супраць царызму. У 1911 г. яго як палітычна небяспечнага адправілі на фронт імперыялістычнай вайны. Там ён у складзе 197-га стралковага палка праводзіў сярод салдат агітацыю супраць самадзяржаўя і вайны. Пасля Лютаўскай рэвалюцыі быў выбраны ў палкавы Савет рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў.

У 1917 г. вярнуўся на радзіму ў Хіславіцкую воласць, дзе арганізаваў атрад з 50 былых франтавікоў для барацьбы з белапалякамі корпуса Доўбар-Мусніцкага. У пачатку студзеня 1918 г. стварыў першую чырвонагвардзейскую роту імя Мсціслаўскага павятвыканкама, з дапамогай якой быў устаноўлены рэвалюцыйны парадак у г. Мсціславе і павеце.

Вясной 1918 г. разам з мясцовымі камуністамі арганізаваў першую ў воласці Фролаўскую камуну і Вепрыеўскую сельскагаспадарчую арцель. У 1919 г. у Арлоўскім атрадзе добраахвотнікаў удзельнічаў у барацьбе супраць войск Дзянікіна. Пад Белградам быў паранены і кантужаны. Пасля выздараўлення ў сакавіку 1920 г. прыбыў на радзіму і быў прызначаны ваеным камісарам Любавіцкай воласці. З 1921 г. працаваў у Смаленскім павеце ваенным камісарам. Як палітэмісар пры штабе Заходняга фронту ўдзельнічаў у падаўленні Кранштацкага паўстання.

З сакавіка 1938 г. – гандлёвы прадстаўнік Кіргізскай ССР у Маскве. Пасля працаваў на розных адміністрацыйных пасадах і выкладаў у Інстытуце імя Пляханава.

У час Вялікай айчыннай вайны – на фронце. У 1943 г. паранены і кантужаны.

З 1945 г. па 1947 г. працаваў начальнікам агульнага аддзела галоўнай інспекцыі Узброенных Сіл СССР, а пазней зноў вярнуўся на работу ў Інстытут народнай гаспадаркі.

Узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі і Айчыннай вайны 1 ступені, васьмю медалямі.

**Літаратура:**

Трубчынскі Якаў Нікіфаравіч: Удзельнікі кастрычніцкай рэвалюцыі// Памяць: Мсціслаўскі раён: Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі. – Мінск, 1999. – С. 116–117.

## 110 год з дня нараджэння Уласенка Вольгі Пракопаўны Героя Сацыялістычнай працы



**Уласенка Вольга Пракопаўна**нарадзілася 20.08.1913 г. у вёскі Парадзіна Мсціслаўскага раёна ў сялянскай сям’і. У 1933–1969 гг. свінарка калгаса «1 Мая» Мсціслаўскага раёна, Магілёўскай вобласці, передавік сельска-гаспадарчай вытворчасці. Званне Героя Сацыялістычнай Працы прысвоена ў 1966 г. за поспехі ў развіцці жывёлагадоўлі і павелічэнні вытворчасці мяса.Узнагароджана ордэнам Леніна,медалём.

Памёрла 30 ліпеня 1996 г.

**Літаратура:**

Уласенка Вольга Пракопаўна // Беларуская ССР:кароткая энцыклапедыя – 1981. – Т. 5.–С. 612.

Уласенка Вольга Пракопаўна: Героі Сацыялістычнай Працы// Памяць: Мсціслаўскі раён: Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі. – Мінск, 1999. – С. 499.

Канаплёва, Л. Росныя травы/ Л. Канаплёва // Магілёўскаяпраўда. – 1975. – 28 лютага.

Канаплёва, Л. Рукі працаўніцы/ Л. Канаплёва // Святло Кастрычніка (Мсціслаў). – 1975. – 8 сакавіка.

Карпенка, М. Красавіцкія зоры/ М. Карпенка // Магілёўскаяпраўда. – 1966. – 1 мая.

Коноплёва, Л. Росные травы/ Л. Коноплёва // Дела их золотом горят. – Минск. – 1976. – С. 101–105.

Юр’еў, Л. Салдацкая спадчына/ Л. Юр’еў // Святло Кастрычніка (Мсціслаў). – 1976. – 10 ліпеня.

## 130 год з дня нараджэння Фядосенка Міхаіла Яфімавіча, Героя Сацыялістычнай працы

**Фядосенка Міхаіл Яфімавіч**нарадзіўся 15 кастрычніка 1893 г. у в. Пірагова Мсціслаўскага павета ў сялянскай сям'і. Пасля заканчэння Маскоўскага тэхнічнага вучылішча ў 1911 г. працаваў на Украіне, потым служыў у царскай арміі. Удзельнік Лютаўскай рэвалюцыі. У верасні 1917 г. быў накіраваны на румынскі фронт у аўтаупраўленне 8-ай Арміі. Там у г. Ясы пазнаёміўся з бальшавікамі і стаў праводзіць агітацыю за спыненне імперыялістычнай вайны і пераход арміі на бок народа. Ад салдат упраўлення 8-ай Арміі выбіраўся дэпутатам Савета рабочых, сялянскіх і салдацкіх дэпутатаў. У пачатку красавіка 1918 г. у сувязі са стварэннем Чырвонай Арміі 8-ая Армія была расфарміравана, і Фядосенка вярнуўся ў Мсціслаў. Спачатку працаваў тэхнікам ад Магілёўскага губвыканкама, потым начальнікам забеспячэння паветваенкамата. У 1919 г. прымаў удзел у ліквідацыі кулацка-эсэраўскага паўстання на Мсціслаўшчыне. З сакавіка 1922 па ліпень 1941 г. працаваў у раёне на розных пасадах.

У 1924 г. ён узначаліў будаўніцтва цеплагідраэлектрастанцыі ў Мсціславе. Па яго праектах былі пабудаваны электрастанцыя на рацэ Віхры, два вадзяных млына і млын па памолу фасфарытнай масы. У 1927 г. арганізаваў камбінат мясцовай прамысловасці.

Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. У 1946 г. дэмабілізаваўся, працаваў намеснікам старшыні Мсціслаўскага райвыканкама, дырэктарам гідраэлектрастанцыі.

Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі "За баявыя заслугі", "За абарону Запаляр'я" і інш.

Памёр 15 жніўня 1974 г.

**Літаратура:**

Фядосенка Міхаіл Яфімавіч: Удзельнікі Кастрычніцкай рэвалюцыі// Памяць: Мсціслаўскі раён: Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі. – Минск, 1999. – С. 117–118.

## 105 год з дня нараджэння Цітова Івана Васільевіча, журналіста, пісьменніка, удзельніка Вялікай Айчынай вайны



**Цітоў Іван Васільевіч**нарадзіўся ў 1918 г. у в. Быстрыца Мсціслаўскага павета ў сялянскай сям'і. Журналіст, пісьменнік, удзельнік Вялікай Айчынай вайны.

Пасля заканчэння Мінскага зааветырынарнага тэхнікума да 1939 г. працаваў у рэдакцыі райгазеты "Бальшавік Мсціслаўшчыны". У 1939 г. скончыў завочна

Мінскі інстытут журналістыкі і прызваны ў Чырвоную Армію. У 1941 г. скончыў Ташкенцкае пяхотнае вучылішча і быў прызначаны адказным сакратаром дывізіённай газеты “Вперед за Родину” 44-ай асобай горна-кавалерыйскай дывізіі. У жніўні ўдзельнічаў у паходзе савецкіх войск у Іран, а ў лістападзе гэтага ж года ў абароне Масквы. Ваяваў на Паўднёва-Заходнім, 3-ім Украінскім франтах. Удзельнік Яска-Кішынёўскай аперацыі, вызвалення Румыніі, Балгарыі, Югаславіі, Будапешта. Тройчы паранены. У маі 1942 г. ён інструктар палітаддзела 113-ай стралковай дывізіі, у сакавіку 1943 г. – старшы інструктар. Вызначыўсяпры фарсіркванні рэк Днепр і Паўднёвы Буг у сакавіку 1944 г., за што быў узнагароджаны ордэнам Айчынай вайны І ступені.

Пасля вайны служыў у складзе Паўднёвай групы войск, у войсках Бакінскай ваеннай акругі, Паўночнай групы войск і Беларускай ваеннай акругі. Быў намеснікам рэдактара дывізійнай газеты, карэспандэнтам і начальнікам аддзела армейскай і акруговай газет, спецкорам. Падпалкоўнік (1950). Пасля звальнення ў запас працаваў загадчыкам аддзела газеты “Звязда”.

Аўтар дакументальных аповесцей “Участковы інспектар”(1978), “Капитан милиции”(1980), “За парогам дазволеннага”(1982). Член Саюза журналістаў, лаўрэат журналісцкіх прэмій журнала “Огонек”, Саюза пісменнікаў Беларусі, газет “Звязда”, “Вечерний Минск”.

Узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, Айчынай вайны І і ІІ ступені, медалямі.

**Літаратура:**

Цітоў Іван Васільевіч: Знакамітыя людзі// Памяць: Мсціслаўскі раён: Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі. – Минск, 1999. – С. 542–543.

## 130 год з дня нараджэння Цырыкава Паўла Канстанцінавіча, удзельнік Кастрычніцкай рэвалюцыі

**Цырыкаў Павел Канстанцінавіч**нарадзіўся ў 1893 г. у в. Будагошча-Гаранка Мсціслаўскага павета ў беднай сялянскай сям’і. З 1914 г. служыў у царскай арміі. Удзельнік першай сусветнай вайны. Ваяваў кулямётчыкам на аўстрыйскім фронце. За храбрасць быў узнагароджаны Георгіеўскім крыжам 3 ступені. У 1918 г. вярнуўся з фронту на радзіму, добраахвотна ўступіў у Чырвоную Армію. Змагаўся з ворагамі савецкай улады. Пры ліквідацыі банды ў Цёмным Лесе 2 жніўня 1919 г. загінуў.

Пахаваны ў Мсціславе ў парку імя Н. Крупскай.

**Літаратура:**

Цырыкаў Павел Канстанцінавіч: Удзельнікі Кастрычніцкай рэвалюцыі// Памяць: Мсціслаўскі раён: Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі. – Мінск, 1999. – С. 117.

## 100 год з дня нараджэння Шакуры Андрэя Трафімавіча, Героя Сацыялістычнай працы



**Шакура Андрэй Трафімавіч**нарадзіўся 27.09.1923 г. у вёскі Міцькаўшчына Мсціслаўскага павета ў сялянскай сям'і. Скончыў Мсціслаўскае педвучылішча (1941), Тамбоўскае пяхотнае вучылішча (1942), Бабруйскую абласную аднагадовую партыйную школу (1947). У Чырвонай Арміі з ліпеня 1941 г. у Айчынную вайну ваяваў на Заходнім, Волхаўскім, Ленінградскім і 3-ім Беларускім франтах, камандзір узвода, роты. Чатыры разы быў паранены, але заўсёды вяртаўся ў строй. З 1945 г. працаваў ў фінансавых органах Мсціслаўскага раёна. З 1953 г. – старшыня калгаса “Чырвонаармеец”, з 1959 г. – старшыня калгаса “21 з'езд КПСС”. За поспехі ў развіцці жывёлагадоўлі, павелічэнні вытворчасці і нарыхтовак мяса, малака і іншай сельгаспрадукцыі ў 1966 г. прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы.Выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР (1959–1967, у 1971–1975 і 1980 гг.), дэпутат Вярхоўнага Савета СССР у 1974–1979 гг.

Узнагароджаны двума ордэнамі Леніна, ордэнамі Кастрычніцкай Рэвалюцыі, Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны 1 ступені, Айчыннай вайны 2 ступені, ордэнам Аляксандра Неўскага, медалямі.

Памёр 6 красавіка 1996 г.

**Літаратура:**

Шакура Андрэй Трафімавіч // Беларуская ССР:кароткая энцыклапедыя.–1981.–Т. 5.–С.658.

Шакура Андрэй Трафімавіч: Героі Сацыялістычнай Працы// Памяць: Мсціслаўскі раён: Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі.–Мінск, 1999.–С. 499–500.

Алисейко, М. Ты со мной, моё поле/ М. Алисейко // Советская Белоруссия.–1974.–13 июня.

Анюкоў, М. Пасланец Мсціслаўшчыны/ М. Анюкоў // Святло Кастрычніка (Мсціслаў).–1971.–30 сакавіка.

Анюкоў, М. У кіпені жыцця/ М. Анюкоў // Звязда.–1971.–13 ліпеня.

Базылева, Т. Жыць для людзей/ Т. Базылева // Святло Кастрычніка (Мсціслаў).–1983.–24 верасня.

Гільбурд, В. Дзеля шчасця людзей/ В. Гільдбурд // Беларусь.–1966.–№10.–С. 6–7.

Гільбурд, В. Прысвяціў сябе людскому шчасцю/ В. Гільдбурд // Магілёўская. праўда.–1966.–9 мая.

Калеснік, А. Талент быць хлебаробам/ А. Калеснік // Калеснік, А. Касмічны Світанак/ А. Калеснік.–Мінск, 1982.–С. 91–122.

Леганьков, В. Криницы/ В. Леганьков // Дела их золотом горят.–Мінск, 1976.–С. 164–172.

## 120 год з дня нараджэння мастака, Шармакова Івана Піліпавіча

**Шармакоў Іван Піліпавіч**нарадзіўся ў 1903 г. ў в. Бахараўка Мсціслаўскага раёна. Скончыў Дняпроўскі інжынерна-будаўнічы інстытут на Днепрабудзе. З 1952 г. сур’ёзназахапляецца выяўленчым мастацтвам. З 1967 г. ўдзельнічае ў мастацкіх выстаўках. Жыве ў Кіеве. Ён трымае творчую сувязь з землякамі. Правёў у Мсціславе 4 персанальныя выставы. Мастак падарыў гораду 50 сваіх работ.

**Літаратура:**

Шармакоў Іван Піліпавіч// Дзеячы выяўленчага мастацтва Магілёўшчыны: біябібліяграфічны паказальнік; [складальнік Цыбулёва Н.М.] – Магілёў, 1993. – С.60.

Піяніда, Б. У дар землякам/ Б. Піяніда// Святло Кастрычніка (Мсціслаў). – 1974. – 14 лютага.

## 95 год з дня нараджэння мовазнаўца, Юрчанкі Георгія Фёдаравіча



**Юрчанка Георгій Фёдаравіч**нарадзіўся 31 студзеня 1928 г. у вёскі Кудрычы Мсціслаўскага раёна. Закончыўшы ў 1940 г. пачатковую школу, прадоўжыў сваю вучобу ў Чырвонагорскай сямігодцы. У 1951 г. скончыў Магілёўскі настаўніцкі інстытут, у 1959г. – Гродзенскі педагагічны інстытут. Настаўнічаў, вучыўся у аспірантуры пры інстытуце літаратуры імя Я. Купалы АН Беларусі. У 1961-1988 гг. працаваў у выдавецтве “Навука і тэхніка” у Мінску.

Друкуецца з 1959 г. У зборніках пародый і эпіграм “Распрэжаны пегас” (1965), “Вярхом на вожыку” (1968), “Немеладычныя мелодыі” (1974), “Парнаскія ўхабы” (1979), “У натхнёнай паграбеньцы” (1983), “Негабляванае пегасня” (1989)вострай сатырай высмейвае хібы, пралікі ў творчасці асобных беларускіх празаікаў, паэтаў, крытыкаў.

Асноўны напрамак навуковай дзейнасці Г.Юрчанкі – дыялектная лексіка і фразеалогія. Плёнам яго вывучэння і сістэматізацыі гаворак Мсціслаўскага раена – мяжы непасрэдных кантактаў сучасных рускіх і беларускіх гаворак стаў “Дыялектны слоўнік:(З гаворак Мсціслаўшчыны)”,у якім растлумачана значэнне 2170 дыялектных слоў, што адсутнічаюць у нарматыўным “Беларуска-рускім слоўніку” ці зарэгістраваны ў ім не з усімі значэннямі. У слоўніку многа арыгінальных мясцовых слоў, падаюцца дзеясловы, якія не маюць адпаведных сінонімаў у літаратурнай мове. Асаблівая ўвага звернута на пераноснае значэнне слоў, надзвычай характэрнае для гаворак Мсціслаўшчыны.

У слоўніку “Народная сінаніміка” на матэрыяле гаворак Мсціслаўшчыны Г.Ф. Юрчанка распрацаваў 440 сінанімічных радоў, у якія ўвайшло больш за 4000 шырокаўжывальных слоў. Слоўнік адлюстроўвае асаблівасці сінанімізацыі лексікі народных гаворак, узаемасувязь народна-дыялектнай лексікі. У ім змешчаны тлумачальны слоўнік 128 дыялектычных слоў, якія не ўвайшлі ў “Дыялектычны слоўнік”, а таксама індэкс усіх дамінант і сінонімаў, прыведзеных у гэтай кнізе.

На аснове мсціслаўскіх гаворак ён склаў фразеалагічны слоўнік у трох тамах: “І коціцца і валіцца”, “І сячэ і паліць”, “Слова за слова”. Тут апрацавана 16150 фразеалагічных выразаў і іх варыянтаў. У канцы кожнай кнігі падаецца слоўнік народных слоў, якія не ўвайшлі ў ранейшыя працы аўтара.

У слоўніку Г.Ф. Юрчанкі “Народнае вытворчае слова: З гаворкі Мсціслаўшчыны” (т. 1-3) на матэрыяле якога 16200 лексічных адзінак шырока паказана форма і словаўтваральная сістэма лексікі ў гаворцы Мсціслаўшчыны, яе выключна багатая сінаніміка і эмацыянальна-вобразная афарбоўка.

У працу “Сучаснае народнае слова: З гаворкі Мсціслаўшчыны: Слоўнік” Г.Ф. Юрчанка ўключыў лексічны матэрыял, сабраны у 1970-1980-я гг. у мсціслаўскіх гаворках (каля 4 тыс. слоў).

Большасць артыкулаў Г.Ф. Юрчанкі па дыялектнай лексіцы раскрываюць цяжкадаступныя і малавывучаныя лексічныя пласты народнай мовы. Ён публікаваў таксама зборы мікратапанімічных і фальклорных матэрыялаў, шматлікія рэцэнзіі на слоўнікі, артыкулы пра мову і мастацкія асаблівасці твораў беларускай літаратуры і інш.

**Літаратура*:***

**Асноўныя навуковыя працы:**

Аддзеяслоўныя і гукапераімальныя выклічнікі з адной вёскі// Народная лексіка. – Мінск, 1977. – С. 168–192.

Адрас любові – слова// ЛіМ.–1997.–15 жніўня.–С. 12.

Асветнік з Кудрыч// Полымя.–1990. – №6. – С. 206–214.

Вечны шукальнік праўды// Святло Кастрычніка (Мсціслаў). – 1990. – 20, 29 сакавіка.

Дзеж павага да чытача?// ЛіМ. – 1981. – 2 кастрычніка. – С. 6–7.

Дыялектны слоўнік: З гаворак Мсціслаўшчыны. – Мінск, 1966. – 227 с.

З лексікі ткацкага начынення данай вёскі// Жывое слова. – Мінск, 1978. – С. 227–240.

З увагай да чалавека// Полымя. – 1962. – №10. – С. 189–190.

Знаўца роднага слова: А.А. Крывіцкаму – 70 // Святло Кастрычніка (Мсціслаў). – 1997. – 6 жніўня.

І коціцца і валіцца: Устойлівыя словазлучэнні ў гаворцы Мсціслаўшчыны.– Мінск, 1972. – 288 с.

І сячэ і паліць: Устойлівыя словазлучэнні ў гаворцы Мсціслаўшчыны. – Мінск, 1974. – 294 с.

Мікратапанімія вёскі Кудрычы Мсціслаўскага раёна// Пытанні беларускай тапанімікі. – Мінск, 1970. –С. 181–188.

Народнае вытворчае слова :З гаворкі Мсціслаўшчыны: у 3 т. – Мінск, 1981–1985.

Народнае вытворчае слова :З гаворкі Мсціслаўшчыны: у 3 т. – Мінск, 1981.– Т. 1: А-Л.–280 с.

Народнае вытворчае слова:З гаворкі Мсціслаўшчыны: у 3 т.–Мінск, 1983.–Т. 2: М-Р. – 304 с.

Народнае вытворчае слова:З гаворкі Мсціслаўшчыны: У 3 т..–Мінск, 1985.– Т. 3: Р-Я–334 с.

Народная сінаніміка.–Мінск, 1969.–280 с.

Нарыс пра вучонага-мовазнаўцу// Полымя.–1969.–№6.–С. 244–245.

Невычэрпанае багацце// ЛіМ.–1969.–16 снежня.

Некаторыя лексічныя групы ў гаворцы Мсціслаўшчыны// З народнага слоўніка.–Мінск, 1975.–С. 239–251.

Пра адзін сінанімічны рад // З жыцця роднага слова : лексікалагічны зборнік–Мінск, 1968.–С. 153–165.

Прыметнікі з памяншальна-ласкальнымі суфіксамі ў гаворцы адной вёскі// Народная словатворчасць.–Мінск, 1979.–С. 171–222.

Прыслоўныя раздзельна-аформленыя ўтварэнні ў гаворцы Мсціслаўшчыны// Народнае слова.–Мінск, 1976.–С. 263–275.

Са скарбніцы роднае слова// ЛіМ.–1970.–13 лістапада.–С. 8.

Скарбы – побач// Полымя.–1965.–№1.–С. 161–165.

Слова пра родную мову// Звязда.–1967.–3 чэрвеня.

Словы ў новым адзенні// Вячэрні Мінск.–1976.–24 лістапада.

Слова за слова: Устойлівыя словазлучэнні ў гаворцы Мсціслаўшчыны.– Мінск, 1977.–271 с.

Сучаснае народнае слова:з гаворкі Мсціслаўшчыны: слоўнік.–Мінск, 1988.–256 с.

Сучасная народная лексіка:з гаворкі Мсціслаўшчыны: слоўнік.–Мінск, 1993.–304 с.

Сучасная народная лексіка:з гаворкі Мсціслаўшчыны: слоўнік.–Мінск, 1998.–351 с.

Твор аб знайдзеннам шчасці// ЛіМ.–1960.–20 студзеня.

У родную мову ўлюблёны// Святло Кастрычніка (Мсціслаў).–1978. –4 ліпеня.

Устойлівыя сінтаксічныя кампаненты ў сінамічным радзе// Лінгвістычныя даследванні.–Мінск, 1968.–С. 128–132.

Як пісалі нашы продкі?// Вячэрні Мінск.–1970.–3 ліпеня.

Беларускае мовазнаўства:бібліяграфічны паказальнік (1966–1975)/ Складальнікі А.Д. Васілеўская, Я.М. Рамановіч.–Мн., 1980.–352 с. (Гл. імянны паказ.)

Беларускае мовазнаўства:бібліяграфічны паказальнік (1976–1985)/ Складальнікі А.Д. Раманоўская, Я.М. Рамановіч.–Мн., 1993.–559 с. (Гл. імянны паказ.)

**Творы і рэцэнзіі на іх:**

Вярхом на вожыку: Літ. пародыі.–Мінск, 1968.–96 с.

Рэц.: Яскевіч, А. Насмешлівым вокам пародыі/ А. Яскевіч // Магілёўская праўда.–1969.–4 сакавіка.

На Мсціслаўскай зямлі ўзгадаваны: Нарыс жыцця і навук. дзейнасці П.П. Кабекі.–Мінск, 1986.–112 с.

Негабляванае пегасня: Літаратурныя пародыі.–Мінск, 1989.–254 с.

Рэц.: Каржанеўская, Г. Ці так пішу я?, Альбо Пахвала жанру/ Г. Каржанеўская // ЛіМ.–1992.–18 верасня.–С. 6–7.

Хацкевіч, В. Трапнасць сатырычнага слова/ В. Хацкевіч // Святло Кастрычніка (Мсціслаў).–1990.–16 студзеня.

Немеладычныя мелодыі: Пародыі і эпіграмы.–Мінск, 1974.–159 с.: іл.

Рэц.: Іпатава, В. І смешна, і трапна/ В. Іпатава // Полымя.–1975.–№11.–С. 250–251.

Усікаў, Я. Талент пісьменніка-парадыста/ Я. Усікаў // Беларусь.–1975.–№4.–С. 28.

Яўсееў, Р. Не дзеля смеху адзінага/ Р. Яўсееў // ЛіМ.–1974.–18 кастрычніка.–С. 7.

Парнаскія ўхабы: Пародыі, эпіграмы.–Мінск, 1979.–127 с.

Распрэжаны пегас: Пародыі і эпіграмы.–Мінск, 1965.–60 с.–(Б-ка “Вожыка”.–№5 (53)).

У натхнёнай паграбеньцы:пародыі.–Мінск, 1983.–143 с.

**Абжыцці, творчасціінавуковайдзейнасці:**

Юрчанка Г.Ф.Беларуская мова:энцыклапедыя.–Мінск, 1994.–С. 638–639.

Юрчанка Георгій Фёдаравіч // Энцыклапедыя літаратура і мастацтва Беларусі.–1987.–Т.5.–С. 673.

Юрчанка Георгій Фёдаравіч: Знакамітыя людзі// Памяць: Мсціслаўскі раён: Гістарычна-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі.–Мінск, 1999.–С. 544–545.

Юрчанка Георгій Фёдаравіч // Пісьменнікі Магілёўшчыны: бібліяграфічны паказальнік: [складальнікі Новікава Н.А., Катлёнак А.А.]–Магілёў, 1993.–С. 247–249.

Г.Ф. Юрчанка // Каляндар знамянальных дат па Магілёўскай вобласці на 1998 год.–Магілёў, 1998.–С. 32–33.

Георгій Юрчанка // Пісьменнікі Савецкай Беларусі: кароткі даведальнік–Мінск, 1981.–С. 388.

Варанчыхіна, А. На зямлі Мсціслаўскай узгадаваны/ А. Варанчыхіна// Святло Кастрычніка (Мсціслаў).–1993.–17 студзеня.

Крыўко, М. Шматграннасць таленту: Юрчанку–60 год/ М. Крыўко // Святло Кастрычніка (Мсціслаў).–1988. –30 студзеня.

Ліўшыц, Ю. На Мсціслаўскай зямлі ўзгадаваны/ Ю. Ліўшыц // Святло Кастрычніка (Мсціслаў).–1992.–16 верасня.

Магілёвец, М. Энцыклапедыст з-пад Мсціслава/ М. Магілёвец// Зямля і людзі.–1996.–22 лютага.

Марціновіч, А Шчодрасці таленту і душы/ А. Марціновіч// ЛіМ.–1998.–30 студзеня.–С. 6–7.

Наркевіч, А. Жывое, народнае/ А. Наркевіч// Пралеска.–1997.–№12.–С. 46–47.

Наркевіч, А. Збіральнік залацінак жывой народнай мовы/ А. Наркевіч// Настаўніцкая газета.–1998.–3 лютага.–С. 4.

Наркевіч, А. І сячэ, і паліць/ А. Наркевіч// ЛіМ.–1998.–13 лютага.–С. 6.

Наркевіч, А. Лексічныя багацці роднага краю/ А. Наркевіч// Пралеска.–1998.–№10.–С. 47.

Усікаў, Я. Талент пісьменніка-парадыста/ Я. Усікаў // Беларусь.–1975.–№4.–С. 28.

Хацкевіч, В. У скарбонку духоўнай культуры/ В. Хацкевіч// Полымя.–1998.–№9.–С. 281–285.

Хацкевіч, В. У скарбонку духоўнай культуры/ В. Хацкевіч// Святло Кастрычніка (Мсціслаў).–1998.–20 мая.

Цімашкова, Н. За родным словам/ Н. Цімашкова// Святло Кастрычніка (Мсціслаў).–1998.–25 лют.

## 140 год з дня нараджэння Якімовіча Антона Іванавіча, Героя Сацыялістычнай працы



**Якімовіч Антон Іванавіч**нарадзіўся 15 чэрвеня 1883 г. у в. Кокатава Мсціслаўскага павета ў сялянскай

сям'і. Удзельнік 1-ай сусветнай, грамадзянскай, Вялікай Айчыннай войнаў, генерал-маёр (1942).

З 1899 па 1901 г. у Харкаве, Кіеве і Тбілісі – рабочы на паравым млыне і фабрыцы мазаічных плітак.

Актыўна ўдзельнічаў у стачках, забастоўках, распаўсюджваў рэвалюцыйныя лістоўкі. За ўдзел у рэвалюцыйных выступленнях яго двойчы арыштоўвалі.

З 1914 г. у арміі, з 1918 г. у Чырвонай Арміі. У перыяд імперыялістычнай вайны на Паўднёва-Заходнім фронце быў актыўным рэвалюцыйным агітатарам.

У перыяд лютаўскай буржуазнай рэвалюцыі служыў у 100-ай артбрыгадзе, быў абраны старшынёй батарэйнага і брыгаднага камітэта, намеснікам старшыні камітэта дывізіі, членам прэзідыума карпуснога салдацкага камітэта, дэлегатам двух салдацкіх з'ездаў Паўднёва-Заходняга фронту.

У студзені 1918 г. добраахвотна ўступіў у Чырвоную Армію і быў залічаны ў Цірaспальскі атрад памочнікам начальніка па артылерыі. Удзельнічаў у аперацыі па раззбраенні гайдамацкага кавалерыйскага палка ў раёне нямецкай калоніі на Украіне, у баях на Паўднёва-Заходнім і Заходнім франтах – камандзірам дывізіёна.

У 1919 г. удзельнічаў у баях супраць белагвардзейскіх полчышчаў Дзянікіна ў раёне Кіева, Жытоміра, Фастава.

У 1920 г. удзельнічаў у баях супраць белапалякаў, прымаў удзел у барацьбе з бандамі Забалотнага на Украіне. За ўдзел у грамадзянскай вайне занесены па загаду Рэўваенсавета 12-ай Арміі на Чырвоную дошку.

У 1923 г. скончыў Вышэйшую артылерыйскую школу. Служыў інструктарам артпалка ў Мангольскай Народнай Рэспубліцы.

У Айчынную вайну з 1941 г. на Паўднёва-Заходнім, Заходнім і 2-ім Беларускіх франтах, камендант Літычэўскага ўмацаванага раёна на Украіне і камендант 154-га ўмацаванага раёна Маскоўскай зоны абароны, камандзір 343-яй Беластоцкай дывізіі.

Дывізія вызначылася пры вызваленні Беластока і атрымала ганаровае званне "Беластоцкай". Пры вызваленні польскага горада Ломжа 25 жніўня 1944 г. генерал-маёр Якімовіч загінуў.

Узнагароджаны 6 ордэнамі, медалямі, ордэнам МНР.

**Літаратура:**

Гасянкоў, У.Л. Якімовіч Антон Іванавіч: Генералы з Мсціслаўшчыны/ У.Л. Гасянкоў// Памяць: Мсціслаўскі раён: Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі. – Мінск, 1999. – С. 263–264.

## 110 год з дня нараджэння Яцевіч Юзефы Валер'янаўны, Героя Сацыялістычнай працы

**Яцевіч Юзефа Валер'янаўна**нарадзілася 17 лютага 1913 г. у в. Парэчча Талачынскага раёна ў сялянскай сям'і. Скончыла сельскагаспадарчы тэхнікум. Працоўную дзейнасць пачала ў 1933 г. у Бялынічскім райземаддзеле загадчыкам насення семянной лабараторыі. Пасля вызвалення раёна ў 1944 г. працавала аграномам. З 1948 г. жыве ў мсціслаўскім раёне. Працавала выкладчыкам школы механізацыі сельскай гаспадаркі, а з 1954 г. па 1968 г. – аграномам у калгасах імя Хрушчова, імя Чапаева, "Шлях камунізма", саўгасе "Мсціслаўскі".

У 1958 г. за дасягненне высокіх паказчыкаў па вытворчасці і нарыхтоўцы мяса, малака, збожжа, бульбы і льна ўзнагароджана ордэнам Леніна.

**Літаратура*:***

Яцевіч Юзефа Валер'янаўна: Узнагароджаны ордэнам Леніна// Памяць: Мсціслаўскі раён: Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі. – Мінск, 1999. – С. 508.

## З гісторыі весак

З нагоды юбілеяў вёсак раім аформіць бібліятэчныя выставы, тэматычныя паліцы на тэмы:

“Гісторыя і сучаснасць роднага краю”, “Ён Радзімаю завецца – непаўторны гэты край”, “Край, дзе мы жывём”, “Каранямі я з роднай зямлі”, “Вёска, у якой я жыву”, “Зямля бацькоў – жыцця крыніца”, “Зямля, дзе пачаўся наш лёс”, “Вёска мая, я часцінка твая”, “Непаўторная, адзіная, малая Радзіма”, “Зямля бацькоў – зямля святая”, “Я вырас тут, і край мне гэты любы” і інш.

Падрыхтаваць мерапрыемствы, гадзіны знаёмстваў, краязнаўчыя гадзіны, урокі пазнання, урокі бацькаўшчыны, краязнаўчыя вандроўкі на тэмы: “Знакамітыя людзі нашай вёскі”, “Ці ведаеш ты сваю вёску?”, “За што я люблю сваю вёску”, “Тут табе пашчаслівела жыць і нарадзіцца”, “Наша малая радзіма – роднае сяло”, “Мой родны, мілы край”, “Край бацькоўскі – мая глыбінка”, “Наша вёска раней і зараз”, “Зямля іх наша ўзгадавала” і інш.

**АНДРАНЫ –** вёска ў Доўгавіцкім с/с, за 33 км ад Мсціслава, 82 км ад Магілева.

У 1858 г. ў вёсцы 15 двароў, 87 жыхароў,уласнасць памешчыка, які меў тут у 1861 г. 230 дзес. зямлі і вадзяны млын. У 1880 г. 22 двары, 95 жыхароў. Частка вяскоўцаў займалася бандарным промыслам. У 1889 г. адкрыта царк.-прыходская школа. Паводле перапісу 1897 г. ў Доўгавіцкай вол. Чэрыкаўскага павета Магілёўскай губ., 29 двароў, 203 жыхары, карчма. У 1909 г. 38 двароў, 240 жыхароў. Побач быў фальварак, 3 двары, 40 жыхароў. На базе дарэв. створана прац. школа 1-й ступені, якой у 1918 г. быў перададзены нацыяналізаваны будынак, у 1925 г. было 58 вучняў. З 17.07.1924 г. ў БССР. У 1926 г. 54 двары, 328 жыхароў. У 1930 г. арганізаваны калгас “Трактар”, які ў 1932 г. аб’ядноўваў 43 гаспадаркі, меў 368 га ворыва, абслугоўваўся Ходасаўскай МТС імя Э. Тэльмана. У 1933 г. пабудавана кузня. З 20.02.1938 г. ў Магілёўскай вобл. У 1940 г. далучана в. Ганчароўка. У Вял. Айч. вайну з ліпеня 1941 г. да 30.09.1943 г. акупіравана ням.-фаш.захопнікамі. У брацкай магіле, што ў цэнтры вёскі, пахавана 2 воіны 95-й стралк. дывізіі 49-й арміі 2-га Бел. Фронту, якія загінулі ў баях супраць гітлераўцаў. На ўшанаванне памяці 77 землякоў, загінуўшых на фронце і ў партыз. барацьбе, у 1966 г. ў цэнтры вёскі пастаўлена стэла. У 1976 г. далучаны вёскі Валымер, Янава. У 1990 г. 79 гаспадарак, 196 жыхароў, у складзе калгаса “Ударнік” (цэнтр – в. Доўгавічы). Працавалі пач. школа, клуб, фельч.-акушэрскі пункт, аддз. сувязі, магазін, комплексны прыёмны пункт быт. абслугоўвання насельніцтва. У 2007 г. ў складзе СВК “Усход”, сярэдняя агульнаадукац. школа, дзіцячы сад, сельскі клуб, б-ка, аддз. сувязі, магазін, комплексны прыёмны пункт быт. абслугоўвання насельніцтва Мсціслаўскага унітарнага камунальнага прадпрыемства “Бытпаслугі”. Планіровачна складаецца з 4 вуліц.

На 01.01. 2022  насельніцтва складае 427 чал.

**БЯЗГАЧАВА** – вёска ў Капачоўскім с/с, за 14 км ад Мсціслава, 88 км ад Магілёва.

У 1768 г. маёнтак у Мсціслаўскім ваяв. ВКЛ, шляхецкая ўласнасць. Пасля 1-га падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у складзе Рас. імперыі. У 1850 г. вёска, 9 двароў, 61 жыхар. уласнасць. Паводле перапісу 1897 г. ў Старасельскай вол. Мсціслаўскага павета, 16 двароў, 97 жыхароў. Побач былі 2 фальваркі (разам 7жыхароў). У 1909 г. ў вёсцы 19 двароў, 123 жыхары, у фальварку 1 двор, 5 жыхароў, у маёнтку 1 двор, 2 жыхары. Дзейнічаў ветраны млын. З 17.07.1924 г. ў складзе БССР. У 1931 г. арганізаваны калгас "Адказ інтэрвентам" (потым імя Варашылава), які ў 1932 г. аб'ядноўваў 86 гаспадарак з вёсак Бязгачава, Кляшчы, Кулікова, Макараўка, меў 604 га ворыва, абслугоўваўся Хлышчоўскай МТС, дзейнічала кузня. З 20.02.1938 г. ў Магілёўскай вбл. У Вял. Айч. вайну з ліп. 1941 г. да 29.09.1943 г. акупіравана ням.-фаш. захопнікамі. У 1976 г. далучана в. Ваўкаўцы. У 1990 г. 22 гаспадаркі, 37 жыхароў, у складзе племсаўгаса "Пісараўшчына" (цэнтр – в. Капачы), працаваў магазін. У 2007 г. вёска далучана да РУСП "Селекцыйна-гібрыдны цэнтр "Віхра".

На 01.01.2022 г. насельніцтва складае 3 чал.

**ВАЎКАЎЦЫ**– вёска ў Ходасаўскім с/с, за 35 км ад Мсціслава, 70 км ад Магілёва.

Па пісьмовых крыніцах вядомы з 1683 г. як в. Ваўкалакі ў складзе маёнтка Горы Віцебскага ваяв. ВКЛ. Пасля 1-га падзелуРэчы Паспалітай (1772) у складзе Рас. імперыі. У 1784 г. ў Чавускім павеце, 4 двары, 39 жыхароў, уласнасць памешчыка. У 1858 г. 12 двароў. Паводле перапісу 1897 г. ў Беліцкай вол. Чэрыкаўскага павета, 35 двароў, 234 жыхары. У 1909 г. 57 двароў, 198 жыхароў. З 17.07.1924 г. ў складзе БССР. У 1931 г. арганізаваны калгас імя Молатава, які ў 1932 г. аб'ядноўваў 35 гаспадарак, меў 196 га ворыва, абслугоўваўся Ходасаўскай МТС імя Тэльмана. З 20.02.1938 г. ў Магілеўскай вобл. У Вял. Айч. вайну з 20.07.1941 г. да 30.09.1943 г. акупіравана ням.–фаш.захопнікамі, якія ў вер. 1943 г. спалілі вёску. Пасля вайны адбудавана. У 1990 г. 4 гаспадаркі, 6 жыхароў, у складзе саўгаса "Забалацце" (цэнтр – в. Забалацце). У 2007 г. ва УКПС "Саўгас "Забалацце".

Радзіма бел. літаратуразнаўца і фалькларыста, чл.-кар. АН БССР І. В. Гутарава (1906-1967).

На 01.01.2022 г. насельніцтва складае 0 чал.

**ВЯЛІКАЯ ЛЕШЧАНКА** – вёска ў Краснагорскім с/с, за 4 км ад Мсціслава, 99 км ад Магілёва.

У 1858 г. вёска ў Мсціслаўскім павеце Магілёўскай губ., 31 рэвізская душа. Паводле перапісу 1897 г. ў Казіміраслабодскай вол. Мсціслаўскага павета, 28 двароў, 207 жыхароў. У 1909 г. 30 двароў, 262 жыхары. З

17.07.1924 г. ў складзе БССР. У 1930 г. арганізаваны калгас імя Будзённага, які ў 1932 г. аб'ядноўваў 38 гаспадарак, меў 188 га ворыва, абслугоўваўся Мсціслаўскай МТС. З 20.02.1938 г. ў Магілёўскай вобл. У Вял. Айч. вайну з ліп. 1941 г. да 28.09.1943 г. акупіравана ням.-фаш. захопнікамі, якія спалілі 30 двароў. Пасля вайны вёска адбудавана. У 1990 г. 33 гаспадаркі, 69 жыхароў, у складзе калгаса "1 Мая" (цэнтр – в. Каробчына). У 2007 г. вёска далучана да СВК "Сож-Агра"

На 01.01.2022 г. насельніцтва складае 11 чал.

**ДУБАСНА** – вёска ў Капачоўскім с/с, за 18 км ад Мсціслава, 113 км ад Магілёва.

У 1768 г. маёнтак у Мсціслаўскім ваяв. ВКЛ, шлях. ўласнасць. Пасля 1-га падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у складзе Рас. імперыі. Памешчык меў тут у 1862 г. 681 дзес. зямлі. У 1882 г. засн. Вінакурны з-д. У 1909 г. фальварак і хутар у Бохацкай вол. Мсціслаўскага павета. З 17.07.1924 г. ў складзе БССР. У 1931 г. арганізаваны калгас, які абслугоўвала Мсціслаўская МТС. З 20.02.1938 г. ў Магілёўскай вобл. У Вял. Айч. вайну з 14.07.1941 г. да 28.09. 1943 г. акупіравана ням.-фаш. захопнікамі. У 1968 г. далучана в. Леснікі. У 1900 г. 50 гаспадарак, 128 жыхароў, у складзе Мсціслаўскага коннага з-да № 120 (цэнтр – в. Лютня). Працавалі магазін, фельч.-акушэрскі пункт. У 2007 г. вёска далучана да РУСП "Селекцыйна-гібрыдны цэнтр "Віхра".

Былая в. Леснікі – радзіма доктара медыцынскіх навук, праф. А. В. Маслакова.

На 01.01.2022 г. насельцтва складае 0 чал.

**КАЛАТОВІНА –** вёска ў Краснагорскім с/с, за 11 км ад Мсціслава, 106 км ад Магілёва.

Па пісьмовых крыніцах у 1618 г. сяло ў Мсціслаўскім павеце, шляхецкая ўласнасць. Пасля 1-га падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у складзе Рас. імперыі. У 1871 г. вёска і маёнтак у Мсціслаўскім ваяв. ВКЛ, шляхецкая ўласнасць. З 17.07.1924 г. ў БССР. У 1934 г. вёска Калатова (22 жыхары), у складзе маёнтка Падлужжа Мсціслаўскага павета, у 1847 г. – 2 двары, 16 жыхароў, уласнасць памешчыка. У 1848 г. ў складзе казённага маёнткаГалоўчыцы, 8 гаспадарак. Паводле перапісу 1897 вёска ў Казіміраваслабадскай вол. Мсціслаўскага павета, пры дарозе Мсціслаў-Клімавічы, 21 двор, 163 жыхары, піцейны дом.Непадалёку была аднайменная сядзіба. У 1905 г.адкрыта вінная крама. У 1909 г. 26 двароў 185 жыхароў. З 17.07.1924 г. ў складзе БССР. У 1931 г. 8 сял. сямей арганізавалі калгас "Чырвоная зара", які ў 1932 г. аб'ядноўваў 23 гаспадаркі, меў 106 га ворыва, абслугоўваўся Мсціслаўскай МТС, дзейнічала кузня. З 20.02.1938 г. ў Магілёўскай вобл. У 1940 г. 30 двароў, 121 жыхар. У Вял. Айч. вайну з ліп. 1941 г. да 29.09.1943 г. акупіравана ням.-фаш. захопнікамі, якія ў вер. 1943 г. поўнасцю спалілі вёску. Пасля вайны адбудавана. У 1990 г. 37 гаспадарак, 68

жыхароў, у складзе калгаса “21 з’езд КПСС” (цэнтр-в. Падлужжа). У 2007 г. вёска далучана да СВК “Сож-Агра”.

На 01.01.2022 г. насельніцтва складае 26 чал.

**КАНДРАТАЎСК** – вёска ў Капачоўскім с/с, за 8 км ад Мсціслава, 103 км ад Магілёва.

Каля вёскі, на равым беразе р. Віхра, захаваўся курганны могільнік (13 насыпаў), які сведчыць аб засяленні гэтых месц у далёкай старажытнасці.

Па пісьмовых крыніцах з 1768 г. маёнтак у Мсціслаўскім ваяв. ВКЛ, шляхецкая ўласнасць. Пасля 1-га падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у складзе Рас. імперыі. У 1834 г. 2 двары, 16 жыхароў, уласнасць памешчыка. Паводле перапісу 1897 г. ў Старасельскай вол. Мсціслаўскага павета, 21 двор, 189 жыхароў. Побач былі 2 аднайменныя фальваркі: у адным – 1 двор, 7 жыхароў, у другім – 1 двор, 11 жыхароў. У 1909 г. ў вёсцы 24 двары, 170 жыхароў, у фальварках Кандратаўск 1 – 1 двор, 9 жыхароў, Кандратаўск 2 – 1 двор, 7 жыхароў. З 17.07.1924 г. ў складзе БССР. У пач. 1930-х г. арганізаваны калгас “Чырвоны араты”, які ў 1932 г. аб’ядноўваў 33 гаспадаркі, меў 318 га ворыва і кузню. Абслугоўвала калгас Мсціслаўская МТС. З 20.02.1938 г. ў Магілёўскай вобл. У Вял. Айч. вайну з 14.07.1941 г. да 28.09.1943 г. акупіравана ням.-фаш. захопнікамі. У 1990 г. 44 гаспадаркі, 103 жыхары, у складзе Мсціслаўскага коннага з-да № 120 (цэнтр – в. Лютня). У 2007 г. вёска далучана да РУПС “Селекцыйна-гібрыдны цэнтр “Віхра”.

На 01.01. 2022 г. насельцтва складае 22 чал.

**КОШ** – вёска ў Ракшынскім с/с, за 23 км ад Мсціслава, 75 км ад Магілёва.

З 1663 г. сяло ў Мсціслаўскім ваяв. ВКЛ. У 1737 г. дзейнічала царква. Пасля 1-га падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у складзе Рас. імперыі. У 1777 г. сяло Коша ў Чэрыкаўскай акрузе Магілёўскай губ. У 1816 г. ў Чэрыкаўскім павеце, 12 двароў, 71 жыхар, уласнасць памешчыка. У 1858 г. 59 рэвізскіх душ, карчма, вадзяны млын. Паводле перапісу 1897 г. ў Доўгавіцкай вол. Чэрыкаўскага павета, 35 двароў, 251 жыхар. У 1909 г. 46 двароў, 264 жыхары. У 1910 г. адкрыта школа (нар. вучылішча). З 17.07.1924 г. ў складзе БССР. У 1931 г. арганізаваны калгас “Парыжская Камуна”, які ў 1932 г. аб’ядноўваў 39 гаспадарак, меў 259 га ворыва, абслугоўваўся Хлышчоўскай МТС, дзейнічала кузня. З 20.02.1938 г. ў Магілёўскай вобл. У Вял. Айч. вайну з ліп. 1941 г. да 29.09.1943 г. акупіравана ням.–фаш. захопнікамі. У 1990 г. 27 гаспадарак, 54 жыхары, у складзе калгаса імя Энгельса (цэнтр – в. Басценавічы). У 2007 г. ў СВК імя Энгельса.

На 01.01.2022 г. насельцтва складае 4 чал.

**КРАСНАЯ ГОРКА** (да 20.04.1939 г. Рылаўшчына)– вёска ў Краснагорскім с/с, за 9 км ад Мсціслава, 104 км ад Магілёва.

У 1768 г. вёска Рылаўшчына ў Мсціслаўскім ваяв. ВКЛ, шляхецкая ўласнасць. Пасля 1-га падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у складзе Рас. імперыі. Паводле перапісу 1897 г. ў Казіміраваслабодскай вол. Мсціслаўскага павета Магілёўскай губ., 20 двароў, 172 жыхары. Побач былі фальваркі Рылаўшчына (1 двор, 4 жыхары) і Новая Рылаўшчына (1 двор, 6 жыхароў). У 1909 г. вёска (20 двароў, 163 жыхары) і 3 фальваркі (разам 3 двары, 18 жыхароў), якія потым зліліся з вёскай. З 1920 г. дзейнічаў Рылаўшчынскі с/с, цэнтр якога знаходзіўся ў в. Малая Зяціца. З 17.07.1924 г. ў складзе БССР. Адкрыта прац. школа 1-й ступені. У 1929 г. арганізаваны калгас "3-і рашаючы", які абслугоўвала Мсціслаўская МТС імя Кірава. З 20.02.1938 г. ў Магілёўскай вобл. У 1940 г. 60 двароў. У Вял. Айч. вайну з ліп. 1941 г. да 29.09.1943 г. акупіравана ням.-фаш. захопнікамі, якія спалілі 22 двары. Пасля вайны адбудавана. У 1990 г. 22 гаспадаркі, 56 жыхароў, у складзе калгаса "21 з'езд КПСС" (цэнтр – в. Падлужжа). Працавалі сярэдняя школа, магазін. У 2007 г. ў СВК "Сож-Агра".

На 01.01.2022 насельніцтва складае 5 чал.

**НЕСЦЕРАВА** – вёска ў Падсолтаўскім с/с, за 28 км ад Мсціслава, 123 км ад Магілёва.

У 1638 г. сяло ў складзе маёнтка Беразетня Мсціслаўскага ваяв. ВКЛ, 55 гаспадарак,шляхецкая ўласнасць. Пасля 1-га падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у складзе Рас. імперыі. У 1834 г. ў Мсціслаўскім павеце, 16 двароў, 117 жыхароў, уласнасць памешчыка. У 1858 г. дзейнічала карчма, з 1870 г. працаваў цагельны з-д. Памешчык меў у 1879 г. 609 дзес.зямлі, вінакурны з-д, млын і краму. Паводле перапісу 1897 г. ў Шамаўскай вол. Мсціслаўскага павета Магілёўскай губ., 54 двары, 402 жыхары. Побач былі 2 аднайменныя фальваркі па 1 двары, у адным – 15, у другім 20 жыхароў. У 1909 г. 71 двор, 482 жыхары і 2 фальваркі (3 двары, 38 жыхароў 1 двор, 2 жыхары). У 1910 г. адкрыта школа граматы, ператвораная ў 1914 г. ў земскую. З 17.07.1924 г . ў складзе БССР. На базе дарэвалюцыйнай адкрыта прац. школа 1-й ступені, якой быў перададзены памешчыцкі будынак (у 1926 г. вучняў). У ёй камсамольская ячэйка наладжвала спектаклі. Працаваў пункт па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых. У ліст. 1930 г. арганізаваны калгас "13-ы Кастрычнік", які ў 1932 г. аб'ядноўваў 84 гаспадаркі, меў 620 га ворыва, абслугоўваўся Курманаўскай МТС. У 1936 г. адкрыты калгасны клуб. З 20.02.1938 г. ў Магілёўскай вобл. У 1939 г. ў вёску былі перавезены з хутароў 21, а ў 1940 г. – 10 двароў. У Вял. Айч. вайну з 14.07.1941 г. акупіравана ням.-фаш. захопнікамі, якія ў вер. 1943 г. загубілі 11 жыхароў. Вызвалена вёска 29.09.1943 г. часцямі 277-й стралк. дывізіі. У 1990 г. 85 гаспадарак, 218 жыхароў, цэнтр калгаса "Камуніст", які спецыялізаваўся на вытворчасці мяса і малака, вырошчванні збожжавых і лёну. Меў 5265 га сельгасугоддзяў, у тым ліку 3791 га ворыва, 53 трактары, 14 збожжа-ўборачных камбайнаў, 25

аўтамашын і іншую тэхніку. У вёсцы працавалі дзіцячы сад, інтэрнат, клуб, магазін, сталовая, фельч.-акушэрскі пункт. У 2007 г. СВК "Курманава", дзіцячы сад, сярэдняя школа, фельч.-акушэрскі пункт, магазін, аддз. сувязі. Ген. План забудовы вёскі распрацаваны ў 1980 г.Белкалгаспраектам.

Радзіма аднаго з кіраўнікоў партыз. руху на тэр. Віцебскай вобл. ў Вял. Айч. вайну, камандзіра Багушэўскай партыз. брыгады і сакратара Багушэўскага падп. Райкома КП(б) Б. Я. Прахарэнкі (1902-64).

На 01.01.2022 насельніцтва складае 217 чал.

**ПЯТРЫГІ –** вёска ў Ходасоўскім с/с, за 35 км ад Мсціслава, 70 км ад Магілёва.

У 1858 г. вёска, 10 двароў, 26 жыхароў, уласнасць памешчыка. У 1880 г. 23 двары, 68 жыхароў. Частка вяскоўцаў займалася бандарным промыслам. Паводле перапісу 1897 г. ў Беліцкай вол. Чэрыкаўскага павета Магілёўскай губ., 56 двароў, 266 жыхароў. У 1909 г. 2 вёскі: у адной – 17 двароў, 35 жыхароў, у другой – 52 двары, 273 жыхары. У 1920-х г. вёскі былі аб'яднаны. З 17.07.1924 г. ў складзе БССР, створана с.-г. т-ва. У 1926 г. 60 двароў, 250 жыхароў. У 1931 г. аб'ядноўваў 43 гаспадаркі, меў 501 га ворыва і кузню. Абслугоўвала яго Ходасаўская МТС імя Тэльмана. З 20.02.1938 г. ў Магілёўскай вобл. У Вял. Айч. вайну з 20.07.1941 г. да 30.09.1944 г. вёска акупіравана ням.-фаш. захопнікамі. У 1990 г. 65 гаспадарак, 152 жыхары, у складзе саўгаса "Забалацце" (цэнтр – в. Забалацце). Працавалі пач. школа, б-ка, магазін. У 2007 г. вёска ва УКСП "Саўгас Забалацце".

Радзіма старшага гранатамётчыка М. С. Мураўёва (1963-84), які загінуў у Афганістане пры выкананні службовых абавязкаў.

На 01.01.2022 г. насельніцтва складае 17 чал.

**ПЯЧКАВІЧЫ** – вёска ў Ходасаўскім с/с, за 27 км ад Мсціслава, 78 км ад Магілёва.

Па пісьмовых крыніцах вядомы з 1523 г. як сяло, уласнасць праваслаўнай царквы. У 1664 г. аддадзена Мсціслаўскаму кармеліцкаму кляштару. У 1768 г. ў Мсціслаўскім ваяв. ВКЛ, шляхецкая ўласнасць. Пасля 1-га падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у складзе Рас. імперыіі. У 1834 г. сяло (84 жыхары) ў Чэрыкаўскім павеце, уласнасць царквы. У 1858 г. меліся піцейны дом, заезны двор. Памешчык тут меў у 1868 г. 125 дзес. зямлі. У 1878 г. адкрыта школа. Частка вяскоўцаў займалася бандарным промыслам. Паводле перапісу 1897 г. ў Доўгавіцкай вол. Чэрыкаўскага павета Магілёўскай губ., 30 двароў, 139 жыхароў. У 1909 г. 15 двароў, 119 жыхароў. Побач была аднайменная аколіца, 26 двароў, 198 жыхароў. З 17.07.1924 г. ў складзе БССР. На базе дарэвалюцыйнай створана прац. школа 1-й ступені, у якой у 1925 г. было 66 вучняў. З 20.08.1924 г. да 20.02.1938 г. цэнтр сельсавета. У 1925 г. створана с.-г. т-ва. У 1926 г. 66 двароў. 416 жыхароў. У жн. 1929 г. арганізаваны калгас "Чырвоны факел", які ў 1932 г. аб'ядноўваў 75 гаспадарак, меў 569 га зямлі. Абслугоўвала калгас Ходасаўская МТС імя

Тэльма. У 1933 г. для школы пабудавана новае памяшканне, у 1938 г. пачаў дзейнічаць Дом культуры. З 20.02.1938 г. ў Магілёўскай вобл. У 1940 г. 75 двароў, 322 жыхары. У Вял. Айч. вайну з 14.07.1941 г. да 28.09.1943 г. акупіравана ням.-фаш. захопнікамі, якія ў вер. 1943 г. спалілі 68 двароў, загубілі 2 жыхароў. У 1966 г. ў цэнтры вёскі на ўшанаванне памяці 101 земляка, што загінулі на фронце і ў партыз. барацьбе, пастаўлены абеліск. Пасля вайны вёска адбудавана. У 1976 г. далучана в. Грозы. У 1990 г. 84 гаспадаркі, 195 жыхароў, у складзе калгаса "26 з'езд КПСС" (цэнтр – в. Усполле). Працавалі пач. школа, б-ка, Дом культуры, фельч.-акушэрскі пункт, аддзяленні сувязі і ашчаднага банка, магазін. У 2007 г. вёска ў складзе ААТ "Мсціслаўскі райаграпрамтэхзаб".

На 01.01.2022 г. насельніцтва складае 0 чалавек.

**РАЗАНЦЫ** – вёска ў Сапрынавіцкім с/с, за 8 км ад Мсціслава, 103 км ад Магілёва.

У 1583 г. сяло ў Мсціслаўскім ваяв. ВКЛ, шляхецкая ўласнасць. Паводле перапісу 1897 г. ў Аслянскай вол. Мсціслаўкага павета, 12 двароў, 76 жыхароў. У 1909 г. 9 двароў, 60 жыхароў, адкрыта школа (нар. вучылішча). З 17.07.1924 г. ў складзе БССР. У 1931 г. акупіраваны калгас, які абслугоўвала Мсціслаўская МТС. З 20.02.1938 г. ў Магілёўскай вобл. У Вял. Айч. вайну з 14.07.1941 г. да 28.09.1943 г. акупіравана ням.-фаш. захопнікамі. У 1990 г. 19 гаспадарак, 46 жыхароў, у складзе калгаса "Савецкая Расія" (цэнтр – в. Сапрынавічы). Працавалі 8-гадовая школа, магазін. Зараз у складзе ААТ "Кастрычнік"

На 01.01.2022 насельніцтва складае 641 чал.

**САКАЛОВА** – вёска ў Падсолтаўскім с/с, за 35 км ад Мсціслава, 130 км ад Магілёва.

У 1713 г. вёска ў Мсціслаўскім ваяв. ВКЛ, шляхецкая ўласнасць.Пасля 1-га падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у складзе Рас. імперыі. Памешчык меў у 1834 г. ў вёсцы 488 дзес. зямлі, карчму і вадзяны млын. У 1860 г. цэнтр маёнтка Мсціслаўскага павета Магілёўскай губ., уласнасць памешчыка. Паводле перапісу 1897 г. ў Шамаўскай вол. Мсціслаўскага павета, 14 двароў, 92 жыхары. Побач быў аднайменны фальварак, 1 двор, 17 жыхароў. У 1909 г. ў вёсцы 18 двароў, 97 жыхароў, уфальварку – 22 жыхары. У 1910 г. адкрыта школа граматы. З 17.07.1924 г. ў складзе БССР. У 1931 г. арганізаваны калгас "Чырвоны дзень", які затым абслугоўваўся Курманаўскай МТС, дзейнічала кузня. З 20.02.1938 г. ў Магілеўскай вобл. У Вял. Айч. вайну з 14.07.1941 г. да 28.09.1943 г. акупіравана ням.-фаш. захопнікамі. У 1990 г. 28 гаспадарак, 78 жыхароў, у складзе калгаса "Камуніст" (цэнт – в. Несцерава). У 2007 г. вёска ў СВК "Курманава".

На 01.01.2022 насельніцтва складае 38 чал.

**САПРЫНАВІЧЫ** – вёска, цэнтр Сапрынавіцкага с/с, за 4 км ад Мсціслава, 99 км ад Магілёва.

У 1853 г. сяло ў Мсціслаўскім ваяв. ВКЛ, шляхецкая ўласнасць. У час вайны Расіі з Рэччу Паспалітай 1654-67 гг. Спустошана ў выніку ваенных дзеянняў. У 1737 г. мелася царква. У 1768 г. паблізу быў маёнтак, шляхецкая ўласнасць. Пасля 1-га падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у складзе Рас. імперыі. Адзін памешчык меў у маёнтку ў 1860 г. 768 дзес. зямлі, млын і карчму, другі – у 1866 г., 140 дзес. зямлі. Паводле перапісу 1897 г. ў Аслянскай вол. Мсціслаўскага павета, 67 двароў, 415 жыхароў, царк.-прыходская школа. Непадалёку былі аднайменныя фальварак (3 двары, 49 жыхароў), вартоўня (1 двор, 6 жыхароў), аколіца (3 двары, 17 жыхароў) і сядзіба (1 двор, 8 жыхароў). У 1909 г. ў сяле 69 двароў, 474 жыхары, у маёнтку 1 двор, 2 жыхары, у аколіцы 4 двары, 6 жыхароў. У 1909 г. ў маёнтку жыла адна з адукаванных жанчын Мсціслаўшчыны А. Стахоўская, якая вельмі высока цаніла неабходнасць адукацыі і ахвяравала 40 тыс. рублёў на будаўніцтва гімназіі (пабудавана ў Мсціславе ў 1908). З 17.07.1924 г. ў складзе БССР. З 20.08.1924, цэнтр сельсавета. На базе дарэвалюцыйнай створана прац. школа 1-й ступені, у 1926 г. ў ёй было 77 вучняў. У сак. 1931 г. арганізаваны калгас, які ў 1932 г. аб'яднoўваў 99 гаспадарак, меў 606 га ворыва, кузню (дзейнічала з 1930). Калгас абслугоўвала Мсціслаўская МТС. З 20.02.1938 г. ў Магілёўскай вобл. У Вял. Айч. вайну ў ліп. 1941 г. акупіравана ням.-фаш. захопнікамі. Вызвалена ў вер. 1943 г. часцямі 344-й стралк. дывізіі. На ўшанаванне памяці 140 землякоў, якія загінулі на фронце і ў партыз. барацьбе, у 1970 г. ў цэнтры вёскі каля будынка клуба пастаўленна стэла. У 1990 г. 115 гаспадарак, 300 жыхароў, цэнтр калгаса "Савецкая Расія", які спецыялізаваўся на мясамалочнай жывёлагадоўлі і вырошчванні лёну. У вёсцы працавалі дзіцячы сад, пач. школа, б-ка, Дом культуры, інтэрнат, клуб, 2 магазіны, сталовая, комплексны прыёмны пункт быт. абслугоўвання насельніцтва, фельч.-акушэрскі пункт, аўтаматычная тэлеф. станцыя. У 2007 г. вёска СВК "Кастрычнік".

Насельніцтва на 01.01.2022 г. складае 199 чал.

**СТАРЫЯ ВІХРАНЫ** – былая вёска ў Сапрынавіцкім с/с, за 10 км ад Мсціслава, 105 км ад Магілёва.

У 1853 г. сяло Вахраны ў Мсціслаўскім ваяв. ВКЛ., шляхецкая ўласнасць. У 1856 г. сяло Старыя Віхраны. Пасля 1-га падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у складзе Рас. імперыі. У 1897 г. сяло (15 двароў, 105 жыхароў) і аднайменны фальварак (1 двор, 7 жыхароў) у Аслянскай вол. Мсціслаўскага павета. У 1909 г. ў сяле 17 двароў, 132 жыхары, у маёнтку 1 двор, 2 жыхары. З 17.07.1924 г. ў складзе БССР. У 1931 г. арганізаваны калгас "Пралетарый", які ў 1932 г. аб'яднoўваў 12 гаспадарак, меў 199 га зямлі, абслугоўваўся Мсціслаўскай МТС імя Кірава. З 20.02.1938 г. ў Магілёўскай вобл. У. Вял. Айч. вайну з 14.07.1941 г. да 28.09.1943 г. акупіравана ням.-фаш. захопнікамі. У 1990 г. 2 гаспадаркі, 3 жыхары, у

складзе калгаса “Савецкая Расія” (цэнтр – в. Сапрынавічы).Зараз знаходзіцца у складзе ААТ “Кастрычнік”.

Насельніцтва на 01.01.2022 складае 5 чал.

**СУДОЎШЧЫНА** – вёска ў Капачоўскім с/с, за 15 км ад Мсціслава, 80 км ад Магілёва.

У 1768 г. сяло ў Мсціслаўскім ваяв. ВКЛ, шляхецкая ўласнасць. У 1834 г. 9 двароў, 92 жыхары, уласнасць памешчыка. У 1909 г. ў Старасельскай вол. Мсціслаўскага павета, 20 двароў, 133 жыхары. З 17.07.1924 г. ў складзе БССР. У 1931 г. арганізаваны калгас “Энергія”, які ў 1932 г. аб’ядноўваў 34 гаспадаркі, меў 176 га ворыва, абслугоўваўся Хлышчоўскай МТС. З 20.02.1938 г. ў Магілёўскай вобл. У Вял. Айч. вайну з ліпеня 1941 г. да 29.09.1943 г. вёска акупіравана ням.-фаш. захопнікамі. У 1990 г. 20 гаспадарак, 41 жыхар, у складзе племсаўгаса “Пісараўшчына” (цэнтр – в. Капачы). У 2007 г. вёска ў РУСП “Селекцыйна – гібрыдны цэнтр “Віхра”.

Насельніцтва на 01.01.2022 складае 1 чал.

**ЯСЬМАНАВА** – вёска ў Ходасаўскім с/с, за 25 км ад Мсціслава, 79 км ад Магілёва.

У 1663 г. аддадзены Мсціслаўскаму кармеліцкаму кляштару. Пасля 1-га падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у складзе Рас. імперыі. У 1777 г. вёска Асманаў у Чэрыкаўскай акрузе. У 1834 г. 66 жыхароў, уласнасць памешчыка. Паводле перапісу 1897 г. ў Доўгавіцкай вол. Чэрыкаўскага павета, 19 двароў, 136 жыхароў, у аднайменным фальварку 2 двары, 12 жыхароў. З 17.07.1924 г. ў складзе БССР. У 1929 г. арганізаваны калгас “Свабодная праца”, які ў 1932 г. аб’ядноўваў 54 гаспадаркі, меў 323 га зямлі, абслугоўваўся Ходасаўскай МТС імя Тэльмана. Працавала пачатковая школа. З 20.02.1938 г. ў Магілёўскай вобл. У Вял. Айч. вайну з 14.07.1941 г. да 28.09.1943 г. акупіравана ням.-фаш. захопнікамі. У 1990 г. 20 гаспадарак, 38 жыхароў, у складзе калгаса “26 з’езд КПСС” (цэнтр – в. Усполле). Дзейнічалі комплексна – прыёмны пункт быт. абслугоўвання насельніцтва, магазін. У 2007 г. вёска ў складзе ААТ “Мсціслаўскі райаргапрамтэхзаб”.

**Каляндар знамянальных і памятных дат на 2023 год**
**Мсціслаўскі раён**

Бібліяграфічны паказальнік

складальнік Хмуровіч Святлана Віктараўна

адказны за выпуск Н. В. Сідарэнка

Дзяржаўная ўстанова культуры
“Сетка публічных бібліятэк Мсціслаўскага раёна”

213453 г. Мсціслаў вул. Пралятарская, 36
Тэлефон (02240)44870
Эл. Пошта: Mstislavl_bib@mail.ru